Фота БелТА.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

25 МАЯ 2019 г. СУБОТА

№ 96 (28963)

ЗВЯЗДА

ПА СТАЛІЧНАЙ «АРБІЦЕ»

Вынікі інспекцыі кальцавой пад кіраўніцтвам Прэзідэнта

Учора ў першай палове дня ўдзельнікі дарожнага руху на Мінскай кальцавой аўтадарозе маглі сустрэць незвычайны картэж на чале з вялікім турыстычным аўтобусам. Абганяючы калону, якая рухалася трохі павольней хуткасці патоку, аўтамабілісты і іх пасажыры наўрад ці маглі здагадацца, што ў аўтобусе едзе Аляксандр Лукашэнка. А трэба было толькі павярнуць галаву! Прэзідэнт асабіста інспектаваў стан МКАД і навакольную інфраструктуру. Наш карэспандэнт ехаў у адным аўтобусе з кіраўніком дзяржавы і змог убачыць усе нюансы высокай інспекцыі.

Фота БелТА.

Думаю, няшмат хто можа сказаць, што за адзін раз праехаў Мінскую кальцавую аўтадарогу цалкам. Мала хто рабіў гэта з мэтай вывучэння сітуацыі на МКАД і побач з ёй. І канешне, яшчэ лепш здзейснілі гэта ў адным аўтобусе з Прэзідэнтам краіны. Больш за 56 кіламетраў шляху — а менавіта столькі складае даўжыня кальцавой — кіраўнік дзяржавы і чыноўнікі пераадолелі ў адным аўтобусе «МАЗ» разам з журналістамі.

«Напэўна, рух на МКАД спыніўся на гэты час?» — задасца пытаннем чытач. Аднак, паколькі інспекцыя праводзілася ў першай палове пятніцы, зачыняць такую важную магістраль для мінчан і гасцей сталіцы было б няправільна. Таму аўтобус з першай асобай спакойна ўключыўся ў немалы, як заўсёды, паток аўтамабіляў на кальцавой. І трэба прызнаць, што асобныя вадзіцелі фур былі крыху збянтэжаныя, калі бачылі ў акне высокага турыстычнага аўтобуса кіраўніка дзяржавы. Пра што ж казаў беларускі лідар падчас паездкі, і як прайшла інспекцыя?

Дарога — горад — краіна

...Непрыкметны з'езд з трасы М3 на ўездзе ў Бараўляны, невялікая паркоўка — менавіта тут пачалося вывучэнне Прэзідэнтам добраўпарадкавання і развіцця тэрыторый уздоўж Мінскай кальцавой аўтадарогі.

Як толькі кіраўнік дзяржавы прыбыў на месца, ён адразу пазначыў тэму сустрэчы. Беларускі лідар нагадаў, што часта крытыкуе чыноўнікаў за дарогі і парадак, а таксама за тыя кірункі дзейнасці, якія звязаны з прыродай. Паводле яго слоў, МКАД — гэта твар Мінска, а Мінск — гэта твар краіны.

«Тут госці, людзі часта ездзяць па гэтых дарогах, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — І справа нават не толькі ў тым, што хутка прыедзе шмат гасцей з усяго свету на Еўрапейскія гульні. Калісьці трэба было гэтую працу актывізаваць».

Звяртаючыся да чыноўнікаў, ён нагадаў, што не раз казаў пра тое, што хацеў бы бачыць уздоўж гэтых дарог. І які вынік? На думку Прэзідэнта, пакуль праца ідзе так сабе. Пры гэтым ён прызнаў, што можа нешта не бачыць, бо нельга пабываць усюды.

«І сёння я хацеў бы проста вам усім пазначыць канкрэтна, якой павінна быць дарога і прыдарожныя ўчасткі», — патлумачыў сутнасць сваёй інспекцыі беларускі лідар.

Трэба разумець, што праца па добраўпарадкаванні не скончыцца пасля буйнога спартыўнага першынства, яна павінна працягвацца. На гэта кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу: «Напэўна, пачнём з асноўных дарог і пойдзем да межаў нашай краіны. Трэба добраўпарадкоўваць Беларусь, нельга спыняцца. Гэта наша «фішка». Хто б сюды ні прыязджаў, усе ахкаюць, як добра, прырода добрая. Але прыродзе трэба не толькі радавацца, не толькі жыць з ёй у міры і згодзе — прыроду трэба і ўпрыгожваць, удасканальваць».

Дарэчы, пакуль чакалі прыезд Прэзідэнта, перад тым як адправіцца на інспекцыю, на некалькі пытанняў пагадзіўся адказаць мэр Мінска Анатоль СІВАК — і ён таксама казаў пра тое, што праца па азеляненні і рамонце дарог з'яўляецца планавай. Ён таксама паведаміў, што ў сталіцы сёлета плануецца высадзіць 8-9 мільёнаў кветак, хоць годам раней высадзілі ўсяго два мільёны. Статыстыка змянілася ў лепшы бок і па дарогах — паклалі больш асфальту, у многіх месцах памянялі тратуарную плітку... Пры гэтым мэр заўважыў, што падчас будаўніцтва новага нельга забываць пра падтрыманне парадку ў старым.

Папярэджанне для нядобрасумленных інвестараў

Безумоўна, Прэзідэнту далажылі аб сітуацыі: пра тое, як выконваюцца яго даручэнні па падтрыманні МКАД і развязак у добрым стане, а таксама аб добраўпарадкаванні тэрыторый каля кальцавой.

Закранулі няпростую тэму недабудаваных будынкаў. Пазіцыя Аляксандра Лукашэнкі тут жорсткая: калі з інвестарам дамовіліся, ён павінен выконваць свае абавязацельствы. Калі ж ён не выконвае, то трэба выкарыстоўваць жорсткія санкцыі. Не зрабіў — нясі адказнасць.

Што датычыцца тэрмінаў будаўніцтва і вонкавага добраўпарадкавання аб'ектаў, то тут ёсць велічыня, на якую варта арыентавацца. На думку беларускага лідара, тры гады — гэта максімальны тэрмін для такой дзейнасці. Бо ў нас як бывае: будоўля доўжыцца і пяць, і сем гадоў, вакол бруд, людзям непрыемна. Так што інвестар павінен памятаць пра насельніцтва, зрабіць нармальна вонкава і добраўпарадкаваць зямлю. Усё астатняе — на яго сумленні.

Даручэнне кіраўніка дзяржавы: навесці тут парадак, паглядзець гэтае пытанне, у некаторых варта нават забраць участкі (на якіх цяпер стаяць даўгабуды), каб іншым непанадна было.

У адказ старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка распавёў, што такі падыход ужо дае вынік: як толькі пачалі адабранне ўчасткаў з даўгабудамі, інвестары паскорылі ўзвядзенне запланаваных аб'ектаў.

Будучыня = электрычнасць

Яшчэ на невялікай паркоўцы акуратна размясціўся транспарт, які будзе актыўна выкарыстоўвацца падчас Еўрапейскіх гульняў. Пяць машын з сімволікай першынства — два аўтобусы МАЗ, «Нёман», а таксама два Geely Atlas белага і чорнага колераў. Такі аўтапарк (вядома, у большай колькасці) здольны вырашыць транспартнае пытанне падчас чэмпіянату. Дарэчы, 320 беларускіх красавераў будуць эксплуатавацца ў якасці таксі для прадстаўнічых гасцей.

Звярнуў увагу на транспарт і Аляксандр Лукашэнка. Размаўляючы з кіроўцамі, кіраўнік дзяржавы расказаў, што яму падабаецца мадэль Atlas. Вердыкт Прэзідэнта — «прыстойная машына». І ў чарговы раз ён закрануў тэму электрамабіляў — такую вытворчасць развіваць неабходна.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка і чыноўнікі рушылі ў бок кальцавой.

Дрэвам — так, плоту — не

Як толькі аўтобус крануўся, Прэзідэнт заклікаў рухацца павольней, каб старанна разгледзець усё вакол. Кіраўнік дзяржавы адразу папярэдзіў: схілы ўздоўж дарогі павінны быць засаджаны дрэвамі (хоць бы елкамі, хвоямі), каб не касіць, бо гэта немалыя затраты.

«Уздоўж дарог павінны быць зялёныя насаджэнні», — падкрэсліў ён і дадаў, што абавязкова асабіста праедзецца і паглядзіць на стан насаджаных дрэў і хмызнякоў, бо сэнсу ў загінулым насаджэнні няма ніякага. Калі нешта загінула — трэба прыбіраць і засаджваць нанова, а потым даглядаць.

«І трэба спытаць тых, хто іх высаджваў, таму што гэта галавацяпства. Калі б гэта адно дрэва з 10—15 прапала, гэта яшчэ дапушчальна, але калі праз адно загінулі дрэвы, гэта ненармальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён звярнуў увагу на недапушчальнасць залішняга выразання і выпілоўвання.

На думку беларускага лідара, калі ў населеным пункце жылыя дамы прымыкаюць да дарогі, то яе трэба больш засадзіць, аднак усё гэта не павінна зарастаць. Вядома, і фасады дамоў павінны быць у годным стане. І, дарэчы, займацца гэтым маглі б самі жыхары. Таксама Аляксандр Лукашэнка заклікаў рэстараны, запраўкі, крамы і іншыя ўстановы ўздоўж дарогі самастойна займацца сваёй тэрыторыяй. «Гэта іх зона адказнасці», — рэзюмаваў ён.

СТАР. 2

Узровень

ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ ХІРУРГІІ

Як у Беларусі трансплантуюць органы і чаму да нас на аперацыі едуць замежнікі

54-гадовую японку Сецуко і аднагадовую беларускую дзяўчынку з Бабруйска Марыяну аб'ядноўвае адна няпростая жыццёвая акалічнасць: яны перажылі перасадку печані ў сталічным навукова-практычным цэнтры хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі і зараз аднаўляюцца ў рэанімацыі. Хутчэй за ўсё, яны б ніколі ў жыцці не сустрэліся, калі б абедзвюм не спатрэбілася дапамога беларускіх трансплантолагаў, пра якіх ведаюць, як паказвае практыка, далёка за межамі нашай краіны.

minsknews.by

Шанц на выжыванне

Японка Сецуко перажыла першую трансплантацыю печані ў адной з клінік Кітая. Але ад інфекцыі, на якую перахварэла жанчына, перасаджаны орган загінуў. На складаную паўторную перасадку жанчыне парэкамендаваў ехаць у Беларусь японскі прафесар. І нашы медыкі літаральна падарылі ёй другое жыццё.

— Сецуко прыехала ў Беларусь яшчэ ў лістападзе мінулага года, чакала аперацыю, мы шукалі падыходзячы донарскі орган, — расказвае **дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег РУМО.** — У сакавіку ёй зрабілі аперацыю — паўторную перасадку печані. Яна пайшла на папраўку, і на сярэдзіну красавіка ў яе нават быў білет на самалёт дадому. Аднак зноў развілася ўскладненне, і мы змясцілі яе ў рэанімацыю. Зараз сітуацыя стабілізавалася.

СТАР. 2

Сацыяльны клопат

КАБ МІНСК СТАЎ ЗРУЧНЫМ ДЛЯ ЎСІХ

Для гэтага гарадская інфраструктура павінна ўлічваць патрэбы кожнага

У Мінску цяпер пражывае амаль 125 тысяч асоб з інваліднасцю (або 6,3 % ад агульнага ліку мінчан). Гэта людзі, якія адчуваюць цяжкасці пры самастойным перамяшчэнні, атрыманні паслуг, інфармацыі, пры арыентаванні ў прасторы. Наколькі наша сталіца камфортная для іх, ці створаны ў горадзе ўмовы для таго, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі маглі весці паўнавартаснае жыццё?

Яшчэ нейкіх шэсць-сем гадоў таму людзі з абмежаванымі магчымасцямі без старонняй дапамогі не маглі выйсці на вуліцу са сваёй кватэры ў шматпавярхоўцы, ім складана было трапіць у краму ці ў дзяржустанову. А спусціцца ў метрапалітэн і зусім было нерэальна: не было ні пандусаў, ні пад'ёмнікаў.

Цяпер 57,3 % аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры Мінска забяспечаны элементамі безбар'ернага асяроддзя, — кажа **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ,** удакладніўшы, што пад элементамі безбар'ернага асяроддзя цяпер разумеецца комплексны падыход — пачынаючы ад паркоўкі і заканчваючы асяроддзем унутры будынка. На гэты год запланавана стварыць безбар'ернае асяроддзе яшчэ на 150 аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры і па месцы жыхарства людзей з інваліднасцю.

СТАР. 7

Вытокі малой радзімы

ЁСЦЬ ТАКАЯ КРЫНІЦА — ГАРАДЫ

На Мазыршчыне ахоўваюць крыніцы, стараюцца захаваць і абазначыць гэтыя гаючыя вытокі — так, напрыклад, як у вёсках Лучажэвічы, Скрыгалаў, Мазуры, Каменка, Акулінка, Раманаўка, Хамічкі, Чырвоная Горка. Ёсць у крыніц і назвы, як, напрыклад, Альховіца ў вёсцы Васькоўка, Кустоўніца ў пасёлку Крынічнае, Добрыца ў вёсцы Нагорная. Несумненна, усе гэтыя вытокі вельмі старажытныя, авеяныя легендамі. За вёскай Маісеевічы, у лесе, сярод пагоркаў бруіцца крыніца з цікавай назвай Гарады. Яна паходзіць ад слова «гарадзішча», якое па-мясцоваму называюць «горадам», і якіх тут некалькі.

Яшчэ адной крыніцай — жывой памяці — з'яўляецца захаваная мясцовая адметнасць, якая бачыцца нават у жаночым святочным строі — адзенні, якое паляшучкі насілі яшчэ зусім нядаўна, у пяцідзясятых і шасцідзясятых гадах мінулага стагоддзя, і якое цяпер рэдка калі ўбачыш. Дырэктар Маісеевіцкага Дома культуры Лідзія НІКАНОВІЧ захавала сапраўдны аўтэнтычны тканы і вышываны шэдэўр, які застаўся ад яе свякрухі, а мастацкі кіраўнік Зінаіда ПІНЧУК *(на фота)* любіць апранаць яго на канцэрты і святы, урачыстыя вечары і традыцыйныя народныя вясковыя гулянні, дэманструе ў ім красу і самабытнасць Палесся.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Тэрэза Мэй сыдзе ў адстаўку 7 чэрвеня

Тэрэза Мэй абвясціла, што прыняла рашэнне сысці ў адстаўку з пасады лідара кіруючай у Вялікабрытаніі кансерватыўнай партыі і, адпаведна, прэм'ер-міністра. Такую заяву яна зрабіла ў пятніцу на парозе сваёй афіцыйнай рэзідэнцыі на Даўнінг-стрыт, 10.

«Сёння я паведамляю, што пайду ў адстаўку ў якасці лідара кансерватыўнай і юніянісцкай партыі ў пятніцу, 7 чэрвеня», — сказала Мэй.

Не Сіндза Абэ, а — Абэ Сіндза. Токіа заклапаціўся выпраўленнем імёнаў

Спачатку прозвішча, потым — імя. Менавіта такі парадак выкарыстоўваецца ў японскай мове пры напісанні імёнаў. Але ў большасці іншых краін ужо даўно прывыклі да іншай паслядоўнасці — спачатку імя, потым прозвішча. Як так атрымалася і навошта Токіа гэта хоча выправіць?

21 мая кіраўнік МЗС Японіі Тара Кона заявіў, што мае намер звярнуцца да замежных сродкаў масавай інфармацыі з просьбай пісаць японскія імёны замежнымі літарамі ў аднолькавым парадку — спачатку прозвішча, а потым асабістае імя. Зараз, на думку міністра, надышоў самы ўдалы час для перамен, бо ў краіне надышла новая эпоха — Рэйва («Прыгожай гармоніі»). Да таго ж хутка ў Японіі пройдзе некалькі важных міжнародных падзей (саміт G20, Алімпійскія гульні), на якіх можна было б замацаваць новае напісанне.

Тара Кона нагадаў, што замежныя СМІ прыводзяць кітайскія і карэйскія імёны менавіта ў такім парадку: спачатку радавое прозвішча, потым — асабістае імя (Сі Цзіньпін, Мун Чжэ Ін і г. д.). «Таму пажадана, каб і імя прэм'ер-міністра Японіі няўхільна пісалі Абэ Сіндза, а не Сіндза Абэ, як цяпер», — падкрэсліў міністр.

Экс-прэзідэнт Аргенціны можа паўстаць перад судом з-за скрадзенага гістарычнага пісьма

Аргенцінскі суддзя Клаўдыа Банадыа папрасіў пракуратуру падрыхтаваць паперы, неабходныя для пачатку судовых слуханняў па справе аб выкрадзеных гістарычных дакументах, знойдзеных у доме сенатара і экс-прэзідэнта Крысціны Фернандэс дэ Кіршнер. Пра гэта паведаміў учора Цэнтр судовай інфармацыі.

Гаворка ідзе пра нататнік экс-прэзідэнта Аргенціны Іпаліта Ірыгаена (1916—1922) і ліст змагара за незалежнасць у Лацінскай Амерыцы Хасэ дэ Сан-Марціна яго чылійскаму аднадумцу Бернарда О'Хігінсу, датаваны 1835 годам. Абодва дакументы былі знойдзены ў доме Фернандэс дэ Кіршнер падчас вобыску па справе аб карупцыі ў верасні 2018 года. Як выявіла следства, запісная кніжка і ліст былі скрадзены з дзяржаўных архіваў Аргенціны і Чылі адпаведна.

На думку Банадыа, расследаванне справы, якое павінна папярэднічаць судовым пасяджэнням, ужо завершана. Цяпер пракуратура і абарона экс-кіраўніка дзяржавы павінны падрыхтаваць дакументы, на падставе якіх суд прыме рашэнне аб пачатку слуханняў.

Банадыа вылучыў у дачыненні да Фернандэс дэ Кіршнер абвінавачванні па артыкуле «ўтойванне, знішчэнне або незаконны вываз гістарычных дакументаў».

ISSN 1990 - 763X

Чулі?!

ЯШЧЭ АДЗІН ЧЭМПІЯНАТ У СКАРБОНЦЫ

Беларусь прыме маладзёжнае першынства па хакеі ў дывізіёне ІА

У барацьбе за гэта права беларуская дэлегацыя апярэдзіла аўстрыйскую. Гэта стала вядома на кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея, які праходзіў у Браціславе.

«Права стаць гаспадарамі гэтага турніру разам з нашай першапачаткова мелі намер аспрэчваць яшчэ тры федэрацыі: Аўстрыі, Даніі і Славеніі. Але дзве апошнія дэлегацыі ў выніку знялі кандыдатуры, прычым датчане — на карысць нашай краіны. У беларуска-аўстрыйскай спрэчцы большасцю галасоў (16 супраць 9) перамагла заяўка ФХБ. Турнір пройдзе з 8 да 14 снежня гэтага года. За адзіную пуцёўку ў топ-10 сусветнага маладзёжнага хакея на беларускім лёдзе будуць змагацца гаспадары, а таксама зборныя U-20 Даніі, Аўстрыі, Латвіі, Славеніі і Нарвегіі», — гаворыцца на сайце Беларускай федэрацыі хакея.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Я зноў выбіраю «Звязду»

Вывучыць мову дапамагла газета

Іван ПЯТРОЎСКІ, што жыве ў аграгарадку Будслаў Мядзельскага раёна, карыстаецца аўтарытэтам сярод землякоў.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Іван Станіслававіч працаваў на розных пасадах у мясцовым калгасе, апошнія дзевяць гадоў кіраваў адкрытым акцыянерным таварыствам «Будслаўскае». Яшчэ з таго часу зарэкамендаваў сябе як добры арганізатар, шчыры і чулы да патрэб людзей чалавек, да якога можна заўжды звярнуцца па дапамогу. Цяпер Іван Пятроўскі на пенсіі, але не сядзіць склаўшы рукі. Можна сказаць, ён грамадскі дзеяч мясцовага маштабу, актывіст, які арганізоўвае землякоў і на суботнікі, і на добраўпарадкаванне вёскі. Ды і сам актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах. На трактары, які калісьці змайстраваў са спісаных дэталяў і вузлоў, дапаможа расчысціць ад лісця парк, вывезці смецце на звалку. Ужо каторае скліканне землякі выбіраюць яго дэпутатам Будслаўскага сельскага Савета дэпутатаў.

Прыемна здзівіла пры сустрэчы тое, што размаўляе Іван Станіслававіч на чыстай беларускай мове.

— «Звязда» мне дапамагла вывучыць і палюбіць матчыну мову. Я даўні прыхільнік вашай газеты. А пачалося наша сяброўства даўно, амаль, гадоў сорак таму. У савецкі час я быў парторгам. Раённае начальства прымушала выпісваць «Звязду» на партарганізацыю, бо тут друкаваліся партыйныя дакументы, справаздачы і пастановы з пленумаў, з'ездаў. Чытаючы гэтыя матэрыялы, цікавіўся адначасова іншымі артыкуламі. І паступова палюбіў газету, прывязаўся да яе, выпісаў асабіста. А затым пачаў размаўляць па-беларуску. Спачатку нясмела, а затым усё больш упэўнена. Мне падабаецца, што выданне прапагандуе роднае слова, народную творчасць, прывівае любоў да спадчыны, абрадаў нашых продкаў. Вельмі падабаюцца рубрыкі «Спытайце пра радзіннае», «Размаўляем па-беларуску».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПА СТАЛІЧНАЙ «АРБІЦЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Згадаў беларускі лідар і транспартныя развязкі — яны не павінны быць пусткамі. «Калі яны пустуюць — гэта ні да чаго», — сказаў ён.

Яшчэ Прэзідэнт закрануў тэму ландшафтнага дызайну ўздоўж дарог. На яго думку, адпаведныя спецыялісты павінны распрацаваць планы. Проста наторкаць дрэвы — гэта дрэнны падыход. Такім чынам, ён прапанаваў сфарміраваць групы з трох чалавек — вопытных дызайнераў, якія распрацуюць планы добраўпарадкавання для канкрэтных тэрыторый. Прэзідэнту спадабалася тэрыторыя каля Парку высокіх тэхналогій — аднак можна зрабіць яшчэ лепш.

Таксама беларускі лідар заклікаў прыбраць усе лішнія платы ўздоўж МКАД. Ад пылу і шуму лепш адгароджваць свае дамы дрэвамі, упэўнены ён. Безумоўна, дзесьці платы неабходныя, у тым ліку ў якасці шумазасцярогі, прызнаў Аляксандр Лукашэнка, але і іх трэба прывесці ў парадак.

Пра Курапаты, дарогі і вынікі

Адным з прыпынкаў на шляху стала ўрочышча Курапаты, дзе нядаўна былі праведзены работы па добраўпарадкаванні. «Тут трэба заняцца дадаткова пасадкай дрэў. І яны, хто там ляжыць (яны нас бачаць), дзякуй скажуць. Па перыметры туі можна, — адзначыў беларускі лідар. — Падумайце, як канчаткова добраўпарадкаваць Курапаты. Некалі мы яшчэ пройдзем, паглядзім. Але недапушчальна, каб хтосьці тут нешта рабіў без дазволу. Гэта ж палітычная дэманстрацыя. Гэта камусьці трэба. Можаш прыйсці, калі ласка, памаліся, пакладзі кветкі і сыходзь, не перашкаджай гэтым людзям».

Безумоўна, у ходзе паездкі беларускі лідар закрануў тэму дарожнага пакрыцця МКАД. На яго думку, маставыя пераходы, шляхаправоды засталіся дзе-нідзе неасфальтаваныя — так, дзесьці іх залаталі, але ў асобных месцах проста кінулі. «Трэба гэта дарабіць. І трэба рабіць назаўсёды», — сказаў ён.

«Павінен сказаць, што за суткі вы больш зрабілі, чым за год. Гэта сведчыць пра тое, што трэба прыязджаць і глядзець, і не толькі мне. За суткі і абкасілі, і выраўнялі, і палілі. Так і трэба працаваць. І давайце прыводзіць у парадак», — рэзюмаваў беларускі лідар вынікі сваёй інспекцыі. Назваў і тэрмін — прыкладна за год, каб падрыхтаваць пасадачны матэрыял, канчаткова вызначыцца з будаўніцтвам тых ці іншых аб'ектаў.

Безумоўна, з гэтай задачай кіраўнік дзяржавы і чыноўнікі дакладна не справяцца самастойна. А вось калі кожны жыхар будзе ставіцца да свайго кавалачка беларускай зямлі па-гаспадарску, то наша прыгожая краіна стане яшчэ прыгажэйшай.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

НАЛАДЗІЦЬ «ДРУЖБУ»

Расія дадаткова паставіць нафту на «Нафтан»

Беларусь і Расія дамовіліся пра пастаўкі для поўнай загрузкі наваполацкага прадпрыемства. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС па выніках сустрэчы са старшынёй урада Расіі Дзмітрыем МЯДЗВЕДЗЕВЫМ.

«Мы сёння дамовіліся, што прымем дадатковыя меры па пастаўцы нафты на «Нафтан», каб завод працаваў не на 65 % загрузкі, а выйшаў на 100 %», — адзначыў старшыня ўрада.

Што да транзіту расійскай нафты праз Беларусь, то, як адзначыў прэм'ер-міністр, у інтарэсах дзвюх краін загрузіць транзітную трубу патрэбнымі аб'ёмамі: «Мы лічым, што ёсць яшчэ час папоўніць аб'ём транзіту, які стандартна праходзіць на працягу года ў бок Заходняй Еўропы, і атрымаць адпаведныя даходы беларускім суб'ектам гаспадарання».

Сяргей Румас паведаміў таксама, што Беларусь і Расія дамовіліся да 21 чэрвеня падрыхтаваць праграму дзеянняў па інтэграцыйным узаемадзеянні ў Саюзнай дзяржаве.

Прэм'еры намераны правесці сустрэчу ў Мінску падчас II Еўрапейскіх гульняў. Па словах Сяргея Румаса, у ходзе візіту Дзмітрыя Мядзведзева ў Мінск будзе абмяркоўвацца праграма дзеянняў па інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве.

Прымаючы ў Маскве Сяргея Румаса, Дзмітрый Мядзведзеў павіншаваў яго з Днём славянскага пісьменства, а беларускі прэм'ер — расійскага калегу з перамогай расійскай зборнай над камандай ЗША на чэмпіянаце свету па хакеі ў Славакіі. Сустрэча старшынь урадаў сёлета ўжо трэцяя. Раней прэм'еры сустракаліся на Еўразійскім міжурадсавеце ў Казахстане і Арменіі.

Паводле БелТА.

MINSK 2019

Дапоўненая рэальнасць, сусветная зорка і 70 фур

Арганізатары Еўрапейскіх гульняў падзяліліся сакрэтамі цырымоніі адкрыцця.

Хэдлайнерам цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў у Мінску 21 чэрвеня стане зорка сусветнага ўзроўню, расказаў журналістам **начальнік упраўлення па цырымоніях і культурнай праграме фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Сяргей ХОМІЧ.** Імёны хэдлайнераў традыцыйна трымаюцца ў сакрэце, але «гэта адназначна вядомая асоба, у якой ёсць вялікія дасягненні ў свеце шоу-бізнесу», — адзначыў ён.

Шоу будзе маштабным, з яркімі пастаноўкамі, маляўнічымі касцюмамі і дэкарацыямі. Па словах прадстаўніка Дырэкцыі гульняў, на цырымоніі выступіць таксама шмат вядомых беларускіх артыстаў, у тым ліку маладых. «Можна быць упэўненым, што людзі, якія прыйдуць на цырымоніі адкрыцця і закрыцця, трапяць на ўнікальную падзею, якая ў бліжэйшыя гады не паўторыцца. Быць гледачом на гэтым мерапрыемстве — рэдкая магчымасць, сюды варта прыйсці», — сказаў Сяргей Хоміч.

Арганізатары адзначаюць, што шоу цырымоніі адкрыцця будзе ўтрымліваць эфекты дапоўненай рэальнасці, а тэхналогія дапоўненай рэальнасці — адна з самых перспектыўных, дзякуючы ёй віртуальныя аб'екты становяцца часткай рэальнай навакольнай карціны. Гасцей зачаруюць прыгажосцю беларускай флоры і фаўны, яны ўбачаць побач з сабой выдатных жывёл і птушак. Але каб убачыць гэтыя элементы шоу, гледачам неабходна ўстанавіць на свае смартфоны або планшэты бясплатную мабільную праграму, якая хутка будзе даступна для запампоўкі ў App Store і Google Play. Праграма «прывязваецца» да пэўнага глядацкага месца на стадыёне і дазваляе ўбачыць элементы дапоўненай рэальнасці проста на экране.

Гасцей цырымоніі чакае не толькі яркае шоу, але і магчымасць прыняць у ім непасрэдны ўдзел дзякуючы адмысловаму глядацкаму рэквізіту, які застанецца ў якасці прыемнага сувеніра на памяць аб Еўрапейскіх гульнях. Кожны госць знойдзе на сваім месцы набор падарункаў, у тым ліку заплечнік і бранзалет.

Традыцыйна цырымонію адкрыцця глядзяць больш людзей, чым спартыўныя спаборніцтвы, таму арганізатары шоу заўсёды імкнуцца максімальна выгадна прадставіць краіну. Беларусь прадэманструе багатае гістарычнае мінулае, культуру, дасягненні і тое, на што робіць стаўку ў будучыні.

Адзначым, што каб даставіць на стадыён абсталяванне для цырымоніі адкрыцця (а гэта некалькі сотняў тон), спатрэбіцца каля 70 фур. Цяпер спецыялісты занятыя на адным з найбольш важных і складаных этапаў мантажу — падвесе тросавай разводкі, — канструкцыі, якая дазваляе артыстам і аб'ектам лётаць. Па перыметры стадыёна будзе вісець больш за 1 тыс. светлавых галоў. Плануецца ўсталяваць каля 3 тыс. кв. м экранаў, паваротныя сцэны, пад'ёмныя механізмы.

Тэхнічныя прагоны арганізатары пачнуць 15 чэрвеня, генеральны прагон з гледачамі адбудзецца 19-га. Дэмантаж абсталявання цырымоніі адкрыцця плануецца пачаць адразу пасля таго, як апошні глядач пакіне стадыён.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ВЫШЭЙШЫ ПЛАТАЖ ХІРУРГІІ

Японка СЕЦУКО перажыла паўторную трансплантацыю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сецуко шырока ўсміхаецца і дазваляе сябе сфатаграфаваць (вось-вось яе зноў перавядуць з рэанімацыйнай палаты ў звычайную). Яна зусім не падобна на чалавека, які апошнія гады ў літаральным сэнсе слова балансаваў на мяжы жыцця. Трансплантацыя ў Беларусі каштавала ёй 150 тысяч долараў. Адна такая складаная аперацыя, зробленая замежнаму грамадзяніну, дазваляе вылечыць 5-6 беларусаў. Алег Румо не хавае, што часта з-за мяжы да нас прыязджаюць пацыенты са складанымі выпадкамі, яму такая практыка цікавая і карысная.

У маленькай Марыяны з Бабруйска свая бяда. Калі ёй было 8,5 месяца, урачы выявілі гепатабластому — злаякасную пухліну печані. Яе мама Настасся арыентуецца ў дыягназах і ў тым, як мяняўся стан дачкі, не горш за дактароў:

— Мы звярнуліся да ўрача з заложаным носікам, а яму не спадабаўся яе жывот. Там было ўшчыльненне. Дома Марыяна працягвала капрызнічаць, было відавочна, што ў яе не ўсё ў парадку. У выніку ў нядзелю мы апынуліся ў дзіцячай бальніцы ў Бабруйску, — расказвае жанчына. — Уначы нам зрабілі ўсе абследаванні — УГД, КТ, але ўрачы не былі да канца ўпэўненыя ў дыягназе, і раніцай мы ўжо аказаліся ў Бараўлянах. Адразу прызначылі чатыры блокі хіміятэрапіі і чатыры — стрымлівальнай тэрапіі. Пухліна была вельмі вялікая — 750 мілілітраў. Але нават на першы блок хіміятэрапіі арганізм адрэагаваў добра — пухліна пачала змяншацца. Пасля трэцяй «хіміі» нас накіравалі сюды.

— Пухліна важыла амаль кілаграм, прытым што дзяўчынка важыць усяго сем, — дадае Алег Румо. — Мы выдалілі ёй пашкоджаную печань і перасадзілі кавалачак бацькавай. З часам яна вырасце да патрэбных памераў.

Тата дзяўчынкі ўжо выпісаўся з бальніцы і паехаў дадому — да старэйшага сына Захара. Марыяна пакуль застаецца ў клініцы пад наглядам медыкаў.

Падчас аперацыі па трансплантацыі печані.

З 2010 года, калі быў утвораны цэнтр, тут трансплантавалі органы 69 дзеткам — не толькі беларусам, але і з суседніх краін. Пра ўсіх у цэнтры памятаюць, адсочваюць іх лёсы і запрашаюць на агульныя святы.

— Гэта хлопчык з Украіны, ён перажыў 25 хірургічных умяшанняў, прыязджаў да нас на Новы год. А вось Ліяна Буйнавец, якая атруцілася белай паганкай, сёння займаецца ў мадэльным агенцтве, — паказвае на стэндзе фота дзяцей, якіх тут выратавалі, Алег Румо.

Гісторыю той жа Ліяны, якая ў 2011 годзе перажыла трансплантацыю, назвалі цудам. Яна гасцявала ў бабулі ў Мазыры, дзе і атруцілася ядавітым грыбам. Яе бабулю медыкам выратаваць не ўдалося, а Ліяна выжыла. Ёй перасадзілі печань васьмімесячнага дзіцяці, бо абследаваць патэнцыйных донараў — бацькоў дзяўчынкі — медыкі проста не паспявалі: лік ішоў на хвіліны. Гэта аперацыя стала другой перасадкай печані пасля атручвання белай паганкай.

Узроставых абмежаванняў няма, ліст чакання — адзін з самых кароткіх

Першая перасадка печані, дарэчы, адбылася ў цэнтры ў 2008 годзе, праз год трансплантавалі комплекс нырка — падстраўнікавая залоза, ў 2012-м годзе — першыя комплексы печань — нырка і сэрца — нырка, з 2014 года пачалі трансплантаваць лёгкія. За 10 гадоў экспарт паслуг павялічыўся ў цэнтры ў 42 разы і дасягнуў летась 7,5 мільёна долараў. Пераважную яго большасць складаюць высокатэхналагічныя аперацыі. Колькасць саміх трансплантацый за час існавання цэнтра павялічылася ў 63 разы. У год тут робіцца звыш 400 такіх аперацый, сёлета выканана ўжо больш за 200.

— Зараз нам важна, каб у невялікіх гарадах — Быхаве, Шчучыне, Ваўкавыску — пацыент атрымаў той жа аб'ём медыцынскай дапамогі, у прыватнасці хірургічнай, што і ў Мінску. Трэба так перагрупаваць дапамогу, каб стварыць буйныя міжраённыя цэнтры з сучасным абсталяваннем, — кажа Алег Румо.

Тым часам аперацыі па трансплантацыі нырак робяцца ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, у Брэсце і Гродне асвоілі перасадку сэрца, у Брэсце працуе праграма па перасадцы печані.

— Беларусь уваходзіць у топ-10 краін па ўзроўні донарства органаў. Мы апярэджваем такія развітыя краіны, як Вялікабрытанія, Канада, Германія, і знаходзімся амаль на такім жа ўзроўні, як ЗША і Францыя. Гэта індыкатар таго, якую колькасць жыццяў мы ратуем. Кожны з нашых грамадзян мае больш магчымасцяў захаваць жыццё, чым жыхар Германіі і Польшчы, — кажа Алег Румо.

Сёння няма ўзроставых абмежаванняў для трансплантацыі. У цэнтры была і 76-гадовая пацыентка, якой перасадзілі нырку. Сярэдні тэрмін чакання аперацыі — каля 14 месяцаў.

— Па многіх пазіцыях ён значна меншы. Хтосьці чакае нырку два месяцы, а нехта з-за сваіх генетычных асаблівасцяў — два гады. Для параўнання адзначу, што ў Вялікабрытаніі тэрмін знаходжання ў лісце чакання — 2,5 года. Беларусь мае адзін з самых кароткіх лістоў чакання і па печані, і па нырцы, і па сэрцы, і па лёгкіх. У год мы выконваем больш аперацый па трансплантацыі нырак, чым знаходзіцца беларусаў у лісце чакання, — падкрэслівае Алег Румо.

Нельга сказаць, што абсалютна ўсе пацыенты папраўляюцца, шпітальная лятальнасць пры трансплантацыях складае 7,6 %. Пры перасадцы печані 91 % пацыентаў пераадольваюць 1-гадовы парог выжывальнасці і 76 % — 5-гадовы. Пры перасадцы нырак 96 % жывуць больш чым 1 год, 91 % — больш чым 5. Разважаючы пра якасць жыцця пасля трансплантацыі, Алег Румо падкрэсліў, што калі ў жанчыны не будзе здароўя, яна не народзіць дзіця. Сёння 41 беларуска пасля перасадкі нырак стала шчаслівай маці і 5 — пасля перасадкі печані.

А выпадак, калі двух здаровых дзетак нарадзіла жанчына, якой быў трансплантаваны комплекс печань—нырка, не мае аналагаў у свеце. 33-гадовай беларусцы зрабілі складаную аперацыю ў красавіку 2015 года. Праз паўтара года яна нарадзіла хлопчыка, яшчэ праз два — дзяўчынку.

Спецыялісты не саступаюць нікому

Унікальныя медыцынскія кадры рыхтуюць у клініцы не толькі для Беларусі. Зараз тут стажыруюцца хірургі з Грузіі і Арменіі, у хуткім часе прыедуць медыкі з Узбекістана. Алег Румо падкрэслівае, што Беларусь пастаўляе на сусветны рынак працы медыкаў самай высокай кваліфікацыі, якія ні ў чым не саступаюць урачам з Германіі, Францыі, ЗША і Японіі.

Летась каля 80 тысяч рублёў было выдаткавана на навучанне спецыялістаў у вядучых міжнародных цэнтрах і для ўдзелу ў сусветных навуковых кангрэсах.

Аднагадовай Марыяне спатрэбілася перасадка печані па прычыне анкалогіі.

— Калі мы будзем лічыць сябе важнымі і вялікімі, замкнёмся ў сабе, то хутка вернемся на той узровень, з якога пачыналі 11—13 гадоў таму, — упэўнены дырэктар навукова-практычнага цэнтра.

Пры гэтым беларускія трансплантолагі выязджаюць для сумесных аперацый за мяжу. Толькі сёлета выканана шэсць такіх перасадак органаў — у Грузіі і Казахстане. У Казахстане ўпершыню была перасаджана нырка 9-месячнаму дзіцяці, а таксама праведзена першая аперацыя па перасадцы комплексу нырка—печань.

Пры гэтым Алег Румо не адмаўляе адтоку медыцынскіх кадраў за мяжу.

— Я бачу, што праблема ёсць, — нашы спецыялісты едуць працаваць за мяжу. Каб пакінуць іх тут, патрэбны сацыяльныя ліфты, добрыя магчымасці, высокая зарплата. Важна, каб яны навучаліся перадавым тэхналогіям і адчувалі сябе запатрабаванымі, а не толькі «падносілі снарады» Румо.

Трэба адзначыць, што зарплата ў цэнтры пастаянна расце. Сёння ва ўрача яна складае больш за дзве тысячы рублёў, у сярэдняга медыцынскага персаналу прыкладна 1300 рублёў.

Падчас наведвання цэнтра Прэзідэнт краіны даручыў пабудаваць новы хірургічны корпус, на што з бюджэту выдаткаваны 121 мільён рублёў. Зараз тут вядуцца актыўныя работы і да канца 2021 года яго мусяць здаць у эксплуатацыю. Корпус разлічаны на 170 ложкаў. Там будуць прымяняцца найноўшыя метады сучаснай хірургіі: ад трансплантацый канечнасцяў да выпраўлення дэфектаў пасля аварый з прымяненнем адытыўных тэхналогій 3D-друку.

Дарэчы, спробы выкарыстоўваць 3D-друк у цэнтры ўжо распачаты. Сумесна з замежнымі медыкамі тут плануюць дапамагчы беларусу, у якога пасля аварыі і злаякаснага захворвання знішчана частка грудной клеткі.

— Перспектывы ў 3D-друку добрыя. Надрукаваць сёння можна што заўгодна. Але важна, каб надрукаванае добра працавала, — кажа Алег Румо.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)
по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть-Транс» (продавец)
извещает о проведении 25 июня 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предмета торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Местонахождение имущества: (лот № 1, 2, 15) г. Гомель, ул. Проселочная, 16а; (лот № 3) г. Барановичи, ул. Тельмана, 102/11; (лот № 4) г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, 13/1; (лот № 5, 9, 10, 11, 12, 13, 14) г. Мозырь – 11 промзона Михалки; (лот № 6, 7) Минская область, Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 9; (лот № 8, 17) Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 187; (лот № 16) Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Октябрьская, 153. ***Примечание:*** имущество реализуется без учета НДС 20 % (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ, при условии выполнения п. 6.11. Указа РБ № 294 от 04.07.2012 г.)			
1	**Грузовой специальный автомобиль MAZ 5902 02** (рег. знак № АК 7769-3), инвентарный номер № 1859036 (по бух. учету), год выпуска – 2012.	**9 068,45**	906,85
2	**Грузовой специальный автомобиль MAZ 5905A2** (рег. знак № АК 8164-3), инвентарный номер №1855570 (по бух. учету), год выпуска – 2010.	**1 225,21**	122,52
3	**Грузовой специальный бункер MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3033-3), инвентарный номер № 2701 (по бух. учету), год выпуска – 2006.	**17 736,56**	1 773,66
4	**Грузовой специальный бункер MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3047-3), инвентарный номер № (по бух. учету), год выпуска – 2006.	**17 709,56**	1 770,96
5	**Грузовой специальный MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3076-3), инвентарный номер № 2360р (по бух. учету), год выпуска – 2004.	**25 712,77**	2 571,28
6	**Грузопассажирский вагон GAZ 2705** (рег. знак № АМ 2464-3), инвентарный номер № м1865 (по бух. учету), год выпуска – 2007.	**334,07**	33,41
7	**Грузопассажирский вагон GAZ 2705** (рег. знак № АМ 2789-3), инвентарный номер № 91 (по бух. учету), год выпуска – 2007.	**322,42**	32,24
8	**Грузовой специальный цистерна MAZ 437040 080** (рег. знак № АМ 2976-3), инвентарный номер № 1896 (по бух. учету), год выпуска – 2002.	**10 220,23**	1 022,02
9	**Седельный тягач MAZ 6430A8 367-020** (рег. знак № АК 7087-3), инвентарный номер № 1820 (по бух. учету), год выпуска – 2009.	**3 225,62**	322,56
10	**Седельный тягач MAZ 6430A8 367-020** (рег. знак № АК 7089-3), инвентарный номер № 1819 (по бух. учету), год выпуска – 2009.	**3 190,39**	319,04
11	**Седельный тягач MAZ 5440A9 327030** (рег. знак № АМ 7725-3), инвентарный номер № 1856158 (по бух. учету), год выпуска – 2011.	**4 204,17**	420,42
12	**Седельный тягач MAZ 5440A8** (рег. знак № АМ2982-3), инвентарный номер № 01934к (по бух. учету), год выпуска – 2008.	**1 006,65**	100,67
13	**Седельный тягач MAZ-MAN 640268** (рег. знак № АК 7800-3), инвентарный номер № 6934 (по бух. учету), год выпуска – 2008.	**2 000,30**	200,03
14	**Седельный тягач MAZ-MAN 640268** (рег. знак № АК 9430-3), инвентарный номер № 1529м (по бух. учету), год выпуска – 2008.	**3 087,83**	308,78
15	**Грузовой специальный автомобиль мусоровоз MAZ 5902 A2** (рег. знак № АМ 3445-3), инвентарный номер №ВЛ550007873 (по бух. учету), год выпуска – 2010.	**11 612,06**	1 161,21
16	**Грузовой специальный цистерна MAZ 5337 A2** (рег. знак № АМ 3447-3), инвентарный номер № ВЛ007296 (по бух. учету), год выпуска – 2008.	**15 303,72**	1 530,37
17	**Грузовой специальный автомобиль MAZ 533702 241** (рег. знак № АМ 3194-3), инвентарный номер № 1891К (по бух. учету), год выпуска – 2005.	**27 023,25**	2 702,33

Продавец: Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс», ул. Книжная, 15Б, 246003, г. Гомель, Республика Беларусь. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 249-56-43, инженер транспортного цеха – Терещенко Павел Александрович. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.) Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Республиканское дочернее унитарное предприятие «Белоруснефть-Транс»):** УНП 491317683, IBAN BY34BPS30121728260119330000, BIC (SWIFT) банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, назначение платежа – задаток за участие в аукционе за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 25 мая 2019 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 июня 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов:
8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Блонский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов гражданам Республики Беларусь, расположенного в Блонском сельсовете

№ лота	Адрес земельного участка кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена рублей	Задаток, рублей
1	д. Заречье, ул. Вишневая, уч-36 № 624480801601000282	0,0940	Сети электроснабжения, водоснабжение, газовый кооператив	1798,55 и плюс расходы за размещение объявления	4777,08	477,70

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Задаток перечисляется на р/с BY13AKBB360 06250200050000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, пр. Дзержинского, 18 БИК банка AKBBBY2X код платежа 04901, УНН 600177637, ОКПО 04430996, Блонский сельисполком.

Аукцион состоится 28 июня 2019 года в 10.00 по адресу: аг. Блонь, ул. Садовая, 4А (здание исполкома) Пуховичского района Минской области. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 25 июня 2019 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры по земельным участкам, подлежат возмещению в установленном законодательстве порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72.

Телефоны: (801713) 44041, 44455, 44646.
Сайт Пуховичского райисполкома.

И З В Е Щ Е Н И Е о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени» 25 июня 2019 года

№ лота	Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь)	Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., к. (с учетом НДС)	Размер задатка, бел. руб., к.	Характеристика объекта	Условие аукциона	Примечание
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-136733, общей площадью 496,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, б-р Непокоренных, 28-5	216 720,00	10 836,00	Наименование изолированного помещения – помещение культурно-просветительного и зрелищного назначения. Помещение расположено в 4-этажном административном здании на 1-2-м этажах и подвале. Стены – кирпичные; перегородки – кирпичные, перекрытия – плиты железобетонные; полы – бетонные, плитка, дощатые; проемы дверные – деревянные, металлические, оконные – деревянные. Имеется центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация	без условий	Часть изолированного помещения площадью 126,2 кв. м обременено договором аренды от 01.04.2017 г. № 174 сроком до 31.03.2020 г.

Аукцион состоится 25 июня 2019 года в 11.00 в каб. 410 в конференц-зале ОАО «Универмаг «Центральный» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 61.
Заявки принимаются ежедневно с 27 мая 2019 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявлений и внесения задатка – 21 июня 2019 года до 17.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона – **25 июня 2019 года с 10.30 до 11.00.**

Продавец: ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени», 212002, г. Могилев, б-р Непокоренных, 28, телефоны – (0222) 48-35-75, 8-029-697-22-68 (vel).

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444 (vel).

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет организатора аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700000871000100 1 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;

- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона в установленном порядке в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом между продавцом предмета аукциона и

АДБІВАЮЧЫ КРОК УЗДОЎЖ ТРЫБУН

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

Гэтымі днямі войскі Мінскага гарнізона рыхтуюцца да святочнага парада, які пройдзе 3 ліпеня ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі. Сёлета ён пачнецца а 21-й гадзіне вечара. Пешая калона трэніруецца на страявым плацы ваеннай камендатуры ў ваенным гарадку Уручча. Карэспандэнты «Звязды» ўбачылі, як гэта адбываецца.

У складзе калоны пройдуць 25 парадных разлікаў, якія складаюць каля чатырох тысяч вайскоўцаў. Ужо па традыцыі парад войскаў адкрыюць суворaўцы. За імі перад трыбунамі пранясуць Сцяг Перамогі і штандары 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў, якія прымалі ўдзел у стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён». Акрамя таго, перад трыбунамі пройдуць кадэты і навучэнцы спецыялізаваных ліцэяў, курсанты Ваеннай акадэміі, ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ, вайскоўцы 120-й і 11-й асобных гвардзейскіх механізаваных брыгад, 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады, 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады і 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння. І гэта яшчэ не ўсё: у парадзе возьмуць удзел і парадныя разлікі ДПК, МУС, МНС, войскаў тэрытарыяльнай абароны, зводнай роты ганаровай варты і зводны аркестр Узброеных Сіл.

Адзін з тых, хто будзе ўдзельнічаць у парадзе, — курсант факультэта ракетных войскаў і артылерыі Ваеннай акадэміі Барыс Мамантаў. Для юнака гэтая місія асабліва пачэсная, калі ўлічыць, што паступіў ён у навучальную ўстанову летась.

— Я раней хадзіў на некалькі парадаў, але як глядач. Ну а цяпер прайду ў калоне. Рэпетыцыі праходу ў нас працяглыя. Ужо дакладна было больш чым тры дзясяткі прагонаў. Адна трэніроўка займае прыкладна дзве з паловай гадзіны. І так — тры разы на тыдзень. Падчас іх нам паказваюць на недахопы. Іх мы і імкнёмся выпраўляць падчас перапынкаў. Спачатку моцна стамляўся: усё-такі надвор'е, скажам, не халоднае, плюс амуніцыя, якая важыць кілаграмаў дзевяць. Але ў рытм уцягнуўся, і цяпер стала прасцей.

Бацька Барыса, Алег Мамантаў, прыйшоў на адну з трэніровак, каб падтрымаць сына.

— Я таксама ўдзельнічаў у парадзе, калі служыў у паветрана-дэсантных войсках у савецкі час у Літве. Было гэта напрыканцы 1980-х гадоў. Парад з удзелам камандуючага быў тады прымеркаваны да юбілею войскаў. Але вось я гляджу, што ў плане падрыхтоўкі ў саслужыўцаў майго сына ўсё куды сур'ёзней. Трэніроўкі, напрыклад, адбываліся ўсяго месяц, а тут яны зацягнуцца на значна большы тэрмін. Ды і нарады ж ніхто не адмяняў. Але я веру, што Барыс з усім справіцца.

Радавы Арцём Фралоў служыць у 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгадзе. Загарэлы хлопец кажа, што трэніроўкі працягваюцца каля месяца.

— Блакітны берэт — гэта сімвал, які ўпрыгожвае мужчыну, — кажа Арцём. — Цяжкасці ёсць, але мы іх паспяхова пераадольваем. Бо хто, акрамя нас саміх, гэта зробіць?! Тым больш што я да войска неаднаразова хадзіў у паходы, быў у турыстычных лагерах. Падчас трэніровак мы трымаем раўненне, постаць, палажэнне зброі, локцяў рук, палажэнне ў шарэнзе, кантралюем пад'ём нагі. Але ўсё пачалося з адбору па росце. Вось паглядзіце: першая шарэнга ў разліку амаль не адрозніваецца ад другой. Я, напрыклад, пайду ў другой шарэнзе.

— Для ўдзелу ў святочным парадзе запрошаны прадстаўнікі васьмі дзяржаў, — зазначыў **намеснік міністра абароны Сяргей ПАТАПЕНКА.** — Парад пачнецца з паветранага эшалона і скончыцца праходжаннем механізаванай калоны. Чакаецца ўдзел трох жаночых разлікаў.

У небе над Мінскам жыхары і госці горада ўбачаць авіяцыйную тэхніку ваенна-паветраных сіл і войскаў проціракетнай абароны. Скончыцца парад плацканцэртам роты ганаровай варты і зводнага ваеннага аркестра Узброеных Сіл. Прыгожым фіналам свята стане салют.

Генеральная трэніроўка парада пройдзе 1 ліпеня на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ БЛІЖЭЙШАЯ ЗА ПОЎНАЧ»

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ВЕСНАВЫ ПРЫЗЫЎ?

Двойчы на год — у маі і ў лістападзе — Узброеныя Сілы, іншыя віды войскаў і вайсковых фарміраванняў папаўняюць навабранцы. У першы дзень адпраўкі на Мінскім гарадскім зборным пункце, што месціцца на вуліцы Ангарскай, сабралася каля ста маладых людзей. Усім ім давядзецца правесці ў армейскіх шэрагах розны тэрмін: камусьці шэсць месяцаў, а камусьці і ўсе 18.

За плячыма Рамана Буліцкага — скончаны спартыўна-тэхнічны факультэт БНТУ. Але, як правіла, выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў атрымліваюць павесткі ўвосень — адразу пасля таго, як перастаюць быць студэнтамі.

— Насамрэч я праходзіў ужо другую медыцынскую камісію, — гаворыць хлопец. — Але зацягнуліся тэрміны, і да канца лістапада цалкам абследавацца я не паспеў. Вось так прызыў для мяне перанёсся на вясну. Паходы да ўрачоў занялі недзе каля месяца... Адзінае — на ваеннай кафедры ў БНТУ я не вучыўся. Таму давядзецца праслужыць год. Але я да гэтага маральна гатовы. На працы казалі, што мяне будзе не хапаць, але куды дзенешся? Я ж быў выкладчыкам у БНТУ. Куды менавіта адпраўлюся — пакуль невядома. Ведаю толькі, што вучэбка чакае мяне ў 2-м Аб'яднаным вучэбным цэнтры ў Печах.

Раман не клікаў на праводзіны нікога з родных. Кажа, што яму так прасцей. Развітаўся з усімі зранку, сабраў рэчы і паехаў сюды.

А вось праводзіць Віталя Дубоўскага прыйшлі дзед, баба і маці.

— Я скончыў Мінскі дзяржаўны машынабудаўнічы каледж па спецыяльнасці «тэхнік-механік». Паспеў папрацаваць паўгода на адным са сталічных заводаў. Мяне таксама прызывалі ўвосень, але я атрымаў адтэрміноўку на паўгода. Справа ў тым, што я вучыўся ад ваенкамата на правы кіроўцы катэгорыі «С». Ужо сказалі, дзе буду служыць — непадалёк ад сталіцы ў часці Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Разам са мной туды паедуць і некалькі хлопцаў, з якімі я разам здаваў на правы.

Да арміі я асабліва не рыхтаваўся. Дома будуць чакаць мама, бацька, дзед, сябры. Дзед быў толькі за тое, каб я адслужыў. Ды і ў самога ёсць такое жаданне. Хачу атрымаць новыя эмоцыі і маральна пасталець.

Маці хлопца, Ала Дубоўская, прызнаецца, што не вельмі гатова да таго, што сына паўтара года не будзе дома. Але, як яна кажа, такі лёс у жанчын — праводзіць сваіх сыноў у войска.

— У мяне дзве дачкі, таму кагосьці з родных даводзіцца праводзіць упершыню, — кажа дзядуля хлопца Мікалай Горбач. — Я сам служыў у 1970—1972 гадах у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння ў горадзе Мірны, што ў Архангельскай вобласці. Унуку казаў, што Мінская вобласць да сталіцы куды бліжэйшая, чым Крайняя Поўнач.

— Сёння мы традыцыйна адпраўляем маладых людзей, прызнаных прыдатнымі да службы, у воінскія часці Узброеных Сіл і іншых фарміраванняў, — кажа **начальнік упраўлення ідэалагічнай працы і сацыяльнай абароны ваеннага камісарыята Мінска палкоўнік Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.** — Я пагутарыў з прызыўнікамі: настрой у іх баявы. Хачу адзначыць, што сёння мы адпраўляем папаўненне для войскаў сіл спецыяльных аперацый, Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Некалькіх хлопцаў накіруюцца ў 72-і Аб'яднаны вучэбны цэнтр.

Адным з іх стане васямнаццацігадовы Максім Савельеў.

— Я вучыўся ў каледжы, але вучобу не скончыў. Прыйшла павестка, і вось я апынуўся пасля медкамісіі тут. Сярод сваякоў ёсць некалькі кадравых афіцэраў, таму можна сказаць, што я пэўнае ўяўленне аб будучай службе атрымаў.

Перад тым як стаць у строй, хлопцы знаёміліся са стралковай зброяй і рыштункам, які дэманстравалі вайскоўцы сіл спецыяльных аперацый.

— Сёння ў вас урачысты, памятны і трывожны дзень, — звярнуўся да прысутных падчас мітынгу **ваенны камісар Мінска Юрый ПІЛІШЧЫК.** — У войску вы атрымаеце ваенна-ўліковую спецыяльнасць, здабудзеце навыкі выкарыстання ўзбраення і ваеннай тэхнікі, праведзяце з карысцю час. Бацькам жадаю цярпення, каб вашы дзеці былі здаровыя і радавалі сваімі лістамі. Прызыўнікам зычу здароўя, аптымізму і ўдачы.

А байцы 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння паказалі прызыўнікам майстар-клас па валоданні зброяй і элементамі рукапашнага бою. Пасля гэтага навабранцы прайшлі ўрачыстым маршам міма трыбуны. Зусім хутка, 15 чэрвеня, іх чакае прыняцце прысягі.

Агулам жа сёлетняй вясной плануецца накіраваць ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і вайсковыя фарміраванні краіны каля 10 тысяч чалавек. Пры гэтым выкліку ў прызыўныя камісіі падлягаюць каля 40 тысяч хлопцаў. Па стане на 15 мая ўжо было дадзена больш чым 20 тысяч адтэрміновак. 80 % з іх звязаны з працягам адукацыі. Астатнія датычацца стану здароўя, сямейнага становішча, часу атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцяў і ажыццяўлення дэпутацкіх паўнамоцтваў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

УЗАЕМНЫЯ ІНСПЕКЦЫІ

З 19 да 25 мая два прадстаўнікі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у складзе групы прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц АБСЕ наведваюць авіябазы і ваенныя аб'екты ўзброеных сіл Бельгіі, Люксембурга і Нідэрландаў. Такія наведванні арганізоўваюцца кожнай дзяржавай — удзельніцай АБСЕ адзін раз у пяць гадоў. Гэта палажэнне рэгламентуецца Венскім дакументам 2011 года.

Акрамя таго, з 21 да 24 мая прадстаўнік Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у складзе інспекцыйнай групы Сербіі ўзяў удзел у правядзенні інспекцыі вызначанага раёна на тэрыторыі Італіі. Мэта інспекцыі — праверка таго, што ў гэтым раёне не праводзіцца ваенная дзейнасць, якая па сваіх параметрах падлягала б папярэдняму паведамленню аб ёй згодна з Венскім дакументам.

Да таго ваенныя з васьмі краін праінспектавалі дзве вайсковыя часці ў Беларусі. З 20 да 23 мая ў нашай краіне знаходзілася дэлегацыя са Злучанага Каралеўства. Інспекцыя правярала, ці ёсць на аб'екце ўзбраенні і ваенная тэхніка, што абмяжоўваюцца Дагаворам аб звычайных узброеных сілах у Еўропе згодна з заяўленай колькасцю. У правядзенні інспекцыі, акрамя пяці ваенных інспектараў Злучанага Каралеўства, удзельнічалі па адным спецыялісце з Італіі, Канады і ЗША. Таксама з 21 да 24 мая з аналагічнай мэтай у Беларусі знаходзілася дэлегацыя з Германіі. Яе суправаджалі па адным ваенным інспектары з Нідэрландаў, Польшчы і Францыі.

МАЛАДАЯ, ТАЛЕНАВІТАЯ, АФІЦЭРСКАЯ

Вызначаны пераможцы конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства»

Сапраўдны давер і каханне, надзейны тыл і адданасць — такімі якасцямі, а яшчэ сапраўднымі творчымі талентамі валодаюць маладыя сем'і афіцэраў Узброеных Сіл Беларусі, якія змагаліся за званне найлепшых у конкурсе «Сям'я — крышталь грамадства».

Працяг казкі

І жылі яны доўга і шчаслива... Такімі словамі заканчваецца мноства казак, і ніхто не ведае, як там далей жылі маладыя... Расказаць на ўсю краіну працяг казкі, паказаць, што адбываецца ў афіцэрскай сям'і, чым займаюцца пасля вяселля прынц і прынцэса, у фінале спаборніцтваў адважыліся шэсць пар. Праўда, адну з іх, сям'ю лейтэнанта Алега СТАРЧАНКІ, камандзіра роты інжынерна-сапёрнага батальёна 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, гледачы так і не пабачылі. Яго жонка Ганна літаральна напярэдадні фіналу легла на захаванне. Кажуць, трымалася да апошняга. Вось гэта я разумею, адданасць і вернасць мужу і справе...

Астатнія пяць пар дэманстравалі свае ўменні ў трох намінацыях конкурсу. Прадстаўлялі «Візітную картку сям'і». Расказвалі пра любыя сэрцу мясціны ў спаборніцтве «Мой родны кут, як ты мне мілы...». Паказвалі свае песенныя, танцавальныя і акцёрскія таленты ў «Творчым конкурсе». На кожнае выступленне ім адводзілася па пяць хвілін. Як ні дзіўна, за гэты час яны паспявалі расказаць прысутным гісторыю сям'і, распавесці пра свае надзеі і мары і нават раскрыць некаторыя сакрэты.

Месца, дзе жывуць сэрца і ўспаміны

Расказваючы ў другім конкурсе пра малую радзіму, удзельнікі з замілаваннем успаміналі свае карані, дзялiліся сакрэтамі, чым дарагія сэрцу іх любыя мясціны.

Віктар Ганчарэнка, начальнік радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны 377-га зенітнага ракетнага палка ВПС і войскаў СПА, разам з жонкай Яўгеніяй і сынамі Аляксандрам і Андрэем расказалі пра памятныя для іх мясціны, абапіраючыся на ўспаміны відавочцаў. Прабабуля жонкі капітана 98-гадовая Яўгенія Казлова добра памятае пра ваенныя і пасляваенныя часы. Родны пасёлак Баравуха, які зусім нядаўна стаў адным з мікрараёнаў Наваполацка, для сям'і Ганчарэнка як кніга гісторыі і натхненне. «Наваполацк — горад казак, якія сталі быллю», — прызналася сямейства ў сумеснай песні.

Капітан Пётр Кабановіч, начальнік курса ваеннага факультэта ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, і яго жонка Кацярына лічаць радзімай не толькі мястэчкі Пагост і Даўгінава, дзе выраслі і вучыліся, але і Мінск, дзе нарадзілася іх сям'я і дзеці.

— Мая айчына Беларусь, табе на вернасць прысягаю, бо беларусам я завусь... Я капітан, і генералам стану, і гэта слова я стрымаю, — паабяцаў, кажучы пра малую радзіму, капітан Кабановіч.

«Сям'я — гэта мы, сям'я — гэта наша, сям'я Казловых на свеце ўсіх лепш» — такой бадзёрай «крычалкай» сустракалі выступленне сям'і Дзмітрыя КАЗЛОВА, намесніка камандзіра па ідэалагічнай рабоце батальёна забеспячэння цэнтра 72АВЦ, якая расказвала пра любоў да роднага Барысава. А жонка капітана Віктарыя праспявала яму шыкоўную песню: «Горад мілы, горад мой, горад над Бярэзінай, прачынаецца вясной».

Старшы лейтэнант Артур КУЦКО, камандзір узвода парашутна-дэсантнай роты 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады сіл спецыяльных аперацый, і яго жонка Марына расказвалі пра родныя мясціны — Пінск і Горкі, а таксама Мінск, які паяднаў іх, у нацыянальных строях і прызнаваліся ў любові да краіны па-беларуску.

Сяброўскія зносіны паміж Беларуссю і Расіяй спалучылі ў сваёй інтэрнацыянальнай пары старшы лейтэнант Ян МАКАРАНКА, намеснік камандзіра вучэбна-трэніровачнага авіяцыйнага звяна 116-й гвардзейскай штурмавой авіябазы ВПС і войскаў СПА, і яго жонка Валерыя. Расказваючы пра свае малыя радзімы, яны ўвасаблялі ў строях нацыянальны каларыт кожнай з краін. Ян — мінчанін, які трапіў на службу ў Ліду, і цяпер самаддана палюбіў горад. Валерыя родам з Сібіры, куды яе дзядуля-беларус у свой час паехаў будаваць горад Лангепас, што ў Цюменскай вобласці. Так склаўся лёс, што дзяўчына, архітэктар па спецыяльнасці, вярнулася з Расіі ў Беларусь, каб будаваць дамы ў Мінску. У сталіцы яны і сустрэлі адно аднаго.

Шчаслівы той, хто шчаслівы ў сябе дома

У гэтых немудрагелістых словах увасоблены сямейны ўклад і быт, які можа стаць руцінным і цяжкім, а можа — яскравым і натхняльным, як ва ўдзельнікаў конкурсу. Як бавіць час дома, яны расказалі ў трэцім паядынку — «Творчым конкурсе».

Сям'я ГАНЧАРЭНКАЎ, пераможцаў конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства», паказала замалёўку пра сустрэчу свята — Дня сям'і. Госці, гасцінцы, верш ад Андрушы, старэйшага з сыноў капітана, сумесная песня — гледачы нібыта зазірнулі ў гасцёўню іх сям'і.

— Пасля першага этапу рукі трэсліся неймаверна. Пасля другога ўжо было спакайней. А ў фінале дзейнічалі па прынцыпе «як пойдзе», — прызнаюцца пераможцы. — Самае хвалюючае было, каб дзеці не збеглі куды-небудзь са сцэны.

Разуменне перамогі не прыйшло яшчэ дагэтуль. Аднак, тым не менш, сям'я накіравана і далей працягваць удзельнічаць у творчых спаборніцтвах.

Успаміны Алены Кароўкінай, бабулі Валерыі Макаранкі, сужэнцы станцавалі на «плошчы». Гэта быў апошні вальс перад тым, як Аляксей Кароўкін (муж Алены Ігараўны і дзядуля Валерыі) адправіўся на фронт і падарыў на памяць каханай хусцінку. Сама жанчына ў гэты час гартала старонкі фотаальбома, і постаці былога паўставалі на сцэне ў асобах Яна і Валерыі. Працягнуўся нумар песняй з падтанцоўкай хлопцаў і дзяўчат з 10 «А» класа Лідскай сярэдняй школы № 9, якія спецыяльна прыехалі падтрымаць сям'ю. Мэтанакіраваныя Макаранкі разлічвалі на першае месца, аднак атрымалі серабро творчых спаборніцтваў.

— Мы столькі новага даведаліся пра творчасць адно аднаго. Да конкурсу столькі не танцавалі, — заўважае Ян.

Сям'я Казловых, якая заняла трэцяе месца ў конкурсе, з дапамогай бутафорыі ператварыла сцэну ў дзіцячы пакой і падчас песні пра зорную краіну паказала сапраўдны кліп пра жыццё сям'і: клапатлівую маму, шчаслівага сына і тату-чараўніка. Трохгадовы Паша Казлоў падчас усіх выступленняў бацькоў быў з імі на сцэне. Малы, здавалася, выступаў па асобнай праграме, танцаваў, бегаў, забаўляўся, але пры гэтым цудоўна ўпісваўся ва ўсе нумары.

— Самае галоўнае, што мы любім адно аднаго. А Пашка хоць і гарэзлівы, але вельмі артыстычны, — кажуць бацькі. — Яго ўжо запрасілі ў тэатральны гурток праз тры гады прыходзіць. Сказалі, прымуць без іспытаў.

Адданыя балельшчыкі сямейства і іх натхняльныя вершаванкі-«крычалкі» сталі для Казловых прыемным сюрпрызам. Як і тое, што атрымалася прасунуцца ў конкурсе так далёка. Перад фіналам давялося мяняць шмат чаго ў выступленні, замарыліся, але цяпер ужо крыху выдыхнулі.

— Гэта ўсе мае саслужыўцы. Іх прыехала каля 30 чалавек. Мы не чакалі такога імпэту ад іх, — кажа галава сямейства.

У сямейным нумары з песняй пра дзвюх сясцёр Беларусь і Расію Кабановічы-мужчыны — Пётр і Дзімка — спявалі, а прыгожая палова — Кацярына з Алінкай збіралі на сцэне кветкі і танчылі.

— Муж мне казаў: нічога не плануй занадта, бо невядома, як павядуць сябе дзеці на сцэне, — прызнаецца Кацярына Кабановіч. — Падчас рэпетыцый Аліна не хацела танцаваць зусім. А тут ёй так спадабалася, што сама пайшла з задавальненнем.

Жанчына знаходзіцца ў дэкрэце, але ўмудраецца пры гэтым падпрацоўваць. Яна лагапед і займаецца з дзеткамі.

— Як толькі муж прыходзіць дадому — я адразу на работу, — жартуе яна ў адказ на маё пытанне, як ёй гэта ўдаецца. — Аднак гэта толькі раз на тыдзень.

— Мы спяваем па вечарах, даўно забыліся, што такое тэлевізар. Стараемся выгадаваць творчых дзяцей. У садку Дзіма ва ўсіх мерапрыемствах удзельнічае: вершы чытае, спявае, — далучаецца Пётр. — У нас як мінімум трое дзетак будзе.

Артур і Марына Куцко літаральна запалілі залу яскравым дынамічным выступленнем. У форме дэсантнікаў яны спявалі, танцавалі і займаліся рукапашным боем. І ўсё гэта на фоне ўдзелу калег старшага лейтэнанта, якія дэманстравалі разнастайныя прыёмы бою, а пад канец песні стварылі жывую піраміду.

Прыёмы з жонкай адпрацоўваліся не па-баявому, а па-паходнаму, кажа Артур Куцко, успамінаючы, як рыхтаваліся да конкурсу:

— Было цяжка, таму што шмат часу праводжу па-за сям'ёй. Нашы вайскі ніколі не сядзяць на месцы. Пастаянныя баявыя дзяжурствы, палявыя выхады, вучэнні ў краіне і за яе межамі. Даводзілася літаральна па начах рыхтавацца, звязвацца з усімі сябрамі, — прызнаўся пасля конкурсу Артур Куцко.

Сям'я кажа, што перамагчы імкнення не было. Было жаданне прадставіць не толькі сваю сям'ю, але і род войскаў, дзе служыць Артур. Гэтую спецыфіку мы і ўклалі ў выступленне.

— Хацелі паказаць, што мы сучасная сям'я, якая не сядзіць на месцы, якая ў несупынным руху, — далучылася Марына. — Я ў пэўным сэнсе таксама адчуваю сябе ваеннай. Раней я была больш мяккая. Цяпер, папрацаваўшы ў Ваеннай акадэміі з мужчынскім калектывам, стала больш строгая, з'явіўся стрыжань.

Пасля конкурсу засталася толькі адна думка: сапраўдны шчаслівы той, хто сустрэў сваю родную палавінку, з якой хочацца бавіць увесь свой час і не страшна пайсці ў разведку, бо ўпэўнены ў надзейным тыле.

Ірына СІДАРОК,
Фота Андрэя САЗОНАВА.

БАНКОВСКИЙ ПРОЦЕССИНГОВЫЙ ЦЕНТР

ЗРОБІМ БЕЗНАЯЎНЫЯ АПЕРАЦЫІ БЯСПЕЧНЫМІ

Банкаўскі працэсінгавы цэнтр аб бяспечным выкарыстанні плацежных картак

Плацяжы з дапамогай банкаўскай карткі сталі звыклай справай кожнага дня для большасці жыхароў нашай краіны. На 9,5 мільёна беларусаў прыпадае больш за 15 мільёнаў банкаўскіх картак, і іх колькасць няўхільна расце.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» ужо амаль 17 гадоў аказвае банкам краіны паслугі па тэхналагічнай і інфармацыйнай падтрымцы безнаяўных разлікаў па плацежных картках. За гэтыя гады сфера безнаяўных разлікаў у Рэспубліцы Беларусь і маштабы дзейнасці прадпрыемства значна змяніліся. Вельмі наглядна гэтыя змены дэманструе дынаміка паказчыкаў з першых гадоў работы прадпрыемства і іх значэнні за апошні год.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» у лічбах

	2003 год	2018 год
Банкаўскія карткі	761,7 тыс.	9 434 тыс.
Фінансавыя аперацыі	2,23 млн/ месяц	113 млн/ месяц
Арганізацыі гандлю і сэрвісу	558	71 451
Плацежныя тэрміналы	3 148	122 109
Банкаматы	350	2 446
Інфакіёскі	53	2 512

Для трымальнікаў картак дзейнасць Банкаўскага працэсінгавага цэнтра больш вядомая па выпадках форс-мажору, калі картка заблакавана ці згублена і трэба звяртацца ў кругласутачную службу падтрымкі.

Разам з тым нараўне з аказаннем паслуг працэсінгу (сукупнасці аперацый па апрацоўцы інфармацыі, якая выкарыстоўваецца пры здзяйсненні плацежных аперацый) вельмі важным для прадпрыемства з'яўляецца дзейнасць па забеспячэнні надзейнасці і бяспечнасці правядзення разлікаў. Прадпрыемства на пастаяннай аснове ажыццяўляе маніторынг аперацый з плацежнымі карткамі банкаў-кліентаў з мэтай выяўлення і папярэджання махлярскіх аперацый.

З актыўным развіццём сферы безнаяўных плацяжоў і з'яўленнем новых тэхналогій аплаты, якія паскараюць і спрашчаюць працэс аплаты тавараў і паслуг, павялічваецца і інтарэс махляроў да магчымасцяў пакарыстацца рэквізітамі картак у карыслівых мэтах.

Эксперты Банкаўскага працэсінгавага цэнтра адзначаюць павелічэнне колькасці махлярскіх аперацый з выкарыстаннем рэквізітаў картак побач з памяншэннем выпадкаў ажыццяўлення махлярскіх аперацый з выкарыстаннем падробленых картак.

Такія паводзіны махляроў тлумачацца развіццём ва ўсім свеце сацыяльнай інжынерыі, ростам кіберзлачыннасці, сферы інтэрнэт-камерцыі, а таксама імкненнем зламыснікаў схаваць махлярскія аперацыі на невялікія сумы пад выглядам легітымных аперацый трымальніка, што ў сваю чаргу павышае прывабнасць атрымання «хуткіх і лёгкіх» даходаў.

Па выніках 2018 года колькасць махлярскіх аперацый па картках банкаў, якія абслугоўваюцца ў Банкаўскім працэсінгавым цэнтры, па тыпе махлярства размеркавалася наступным чынам:

95 працэнтаў махлярскіх аперацый прыпадае на махлярства з выкарыстаннем рэквізітаў картак;

3 працэнты незаконных аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі прыпадае на аперацыі па падробленых картках;

2 працэнты прыпадае на махлярскія аперацыі па згубленых ці скрадзеных картках.

У канцы 2018 года павялічылася колькасць махлярскіх аперацый з выкарыстаннем рэквізітаў картак з прымяненнем тэхналогіі 3D Secure, што выклікана ўсплёскам фішынгу (махлярства, мэтай якога з'яўляецца атрыманне доступу да лагінаў і пароляў) з прымяненнем сацыяльнай інжынерыі ў адносінах да даверлівых і бесклапотных грамадзян, якія выдаюць махлярам усе неабходныя для ажыццяўлення плацяжоў ці пераводаў рэквізіты, уключаючы даныя для доступу да сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання і паролі 3D Secure.

Стабільна высокі ўзровень колькасці кампраметацыі даных трымальнікаў картак з дапамогай шкоднага праграмнага забеспячэння, а таксама на разнастайных сайтах з сумнеўнай рэпутацыяй.

Летась лідарамі па выкарыстанні падробленых картак у банкаматах былі краіны Азіі: 64 працэнты — Індыя, 28 — Інданезія. Два працэнты прыпадае на долю ЗША і шэсць працэнтаў, што засталіся, — на Расійскую Федэрацыю, Дамініканскую Рэспубліку і Тайвань.

А ў топ-спіс краін, у якіх карткі беларускіх банкаў падвяргаліся скімінгу (крадзеж даных карткі для наступнага выраву падробнай), уваходзяць Расійская Федэрацыя, Украіна, Турцыя, Італія, Вялікабрытанія, Балгарыя. У Санкт-Пецярбургу скімінгу падвяргаліся 68 працэнтаў ад агульнай колькасці картак, па якіх прайшлі махлярскія аперацыі з выкарыстаннем падробленых картак у 2018 годзе.

Дзякуючы рабоце, што пастаянна праводзіцца Банкаўскім працэсінгавым цэнтрам сумесна з банкамі і плацежнымі сістэмамі па мінімізацыі ўзроўню махлярства з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак, колькасць махлярскіх аперацый ва ўстройствах банкаў, падключаных да прадпрыемства, у 2018 годзе знізілася на 13 працэнтаў.

Разам з тым і ад паводзін саміх трымальнікаў карткі залежыць бяспечнасць безнаяўных аперацый.

Банкаўскі працэсінгавы цэнтр напамінае асноўныя правілы па бяспечным выкарыстанні банкаўскіх плацежных картак.

Выкананне гэтых правілаў звядзе да мінімуму рызыку стаць ахвярай махляра.

Выконвайце асноўныя правілы карыстання карткай

Ніколі не ўказвайце свой ПІН-код на адваротным боку карткі і не захоўвайце яго разам з карткай.

Ніколі не ўводзьце даныя сваёй банкаўскай плацежнай карткі (нумар, тэрмін дзеяння, трохзначны код бяспекі CVV2/CVC2 на адваротным боку карткі, банкаўскі код пацвярджэння аперацыі з СМС-паведамлення) на неправераных сайтах, якія выклікаюць у вас падазрэнне.

Завядзіце асобную картку для здзяйснення аперацый у сетцы Інтэрнэт і для паездак за мяжу

Для здзяйснення плацежных аперацый у сетцы Інтэрнэт завядзіце картку да асобнага рахунку, які вы будзеце папаўняць на неабходную суму для ажыццяўлення пэўнага плацяжу непасрэдна перад яго ажыццяўленнем.

Тым, хто плануе паездку ў іншую краіну (асабліва ў гарады павышанай рызыкі, такія як Санкт-Пецярбург, Адэса і Кіеў), рэкамендуем заводзіць асобную картку (абавязкова перавыпускайце картку пасля наведвання краін з сумнеўнай рэпутацыяй), а знаходзячыся ў ёй, карыстацца банкаматамі, размешчанымі непасрэдна ў аддзяленнях банкаў; ажыццяўляць пакупкі з дапамогай карткі толькі ў буйных магазінах, пры гэтым не выпускаць яе з поля зроку.

Устанавіце ліміты (абмежаванні) на правядзенне аперацый па картцы, гэта дазволіць знізіць страты ад махлярства ў выпадку крадзяжу/страты карткі ці кампраметацыі яе рэквізітаў.

Падключыце паслугу дадатковай аўтэнтыфікацыі 3D Secure і СМС-інфармавання

Пры здзяйсненні пэўнай плацежнай аперацыі ў сетцы Інтэрнэт на нумар вашага мабільнага тэлефона будзе прыходзіць спецыяльны код, які трэба ўвесці, каб правесці гэтую аперацыю.

Памятайце аб тым, што **ніколі не варта нікому паведамляць пароль 3D Secure альбо сеансавыя ключы.**

Гэтыя паролі можна выкарыстоўваць толькі для пацвярджэння аперацыі ў сетцы Інтэрнэт, якая праводзіцца непасрэдна вамі.

Падключэнне **СМС-інфармавання дазволіць вам** не толькі **кантраляваць рух грашовых сродкаў** па рахунку, але і **аператыўна рэагаваць** на спробы здзяйснення махлярскіх аперацый.

Не ажыццяўляйце ўвод пароля 3D Secure, калі адсутнічае бяспечнае злучэнне па пратаколе https

У апошні час усё большую папулярнасць набывае спосаб крадзяжу даных пры дапамозе выкарыстання вэб-рэсурсаў, якія цалкам імітуюць рэсурсы вядомых банкаў, плацежных сістэм альбо іншых ведамстваў, што выклікаюць давер у карыстальнікаў. Гэта так званыя фішынгавыя сайты — махлярскія вэб-рэсурсы, што выманьваюць рэквізіты банкаўскіх плацежных картак.

Аплачвайце толькі на надзейных сайтах

Правядзіце праверку сайта, загадзя вывучыўшы водгукі карыстальнікаў інтэрнэт-рэсурсу, які вас цікавіць.

Зламыснікі могуць называць сябе работнікамі банка альбо Службы сэрвісу кліентаў ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр», выкарыстоўваць закрытыя тэлефонныя нумары альбо праграмы-ананімайзеры, што падмяняюць нумары тэлефонаў на рэальныя нумары, размешчаныя на афіцыйных рэсурсах арганізацый.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» напамінае, што пры тэлефанаванні **работнікі банка альбо Службы сэрвісу кліентаў ніколі не запытваюць інфармацыю пра поўны нумар банкаўскай плацежнай карткі, тэрмін дзеяння, CVC/CVV-код, паролі 3D Secure, аднаразовыя пацвярджальныя коды.**

Ні ў якім разе не паведамляйце інфармацыю аб рэквізітах банкаўскай карткі, логінах і паролях, СМС-кодах, сеансавых ключах да інтэрнэт-банкінгу і мабільных праграм.

У выпадку з'яўлення званкоў з просьбамі ўдакладніць вашы даныя неадкладна звярніцеся ў банк на нумары тэлефонаў, што ўказаны на афіцыйным сайце.

Пры звяртанні сяброў праз сацыяльныя сеткі з просьбай аб дапамозе ў пераводзе грашовых сродкаў на картку альбо аплаце мабільнай сувязі, білетаў і да т. п. пераканайцеся, што асоба, якая звярнулася праз старонку ў сацыяльнай сетцы, з'яўляецца менавіта тым, за каго сябе выдае.

Давайце разам зробім безнаяўныя аперацыі больш бяспечнымі!

З актыўным развіццём сферы безнаяўных плацяжоў і з'яўленнем новых тэхналогій, якія паскараюць і спрашчаюць працэс аплаты тавараў і паслуг, павялічваецца і інтарэс махляроў да магчымасцяў пакарыстацца рэквізітамі картак у карыслівых мэтах.

Не ўводзьце даныя карткі на сайтах, што прапануюць паўдзельнічаць у разнастайных акцыях з наступнай выплатай грашовых прызоў. Настойваюць на пераводзе на рахунак? Падумайце двойчы!

Любая просьба перавесці грашовыя сродкі для атрымання выйгрышу павінна насцярожыць вас.

З «акна», якое з'явілася (усплыло) на экране ноўтбука ці тэлефона, вы даведаліся, што выйгралі прыз?

Падумайце, а ці не выйгралі вы вірус?

Будзьце пільнымі са званкамі, што прапаноўваюць вам фінансавыя інвестыцыі

Калі вам тэлефануюць і прапануюць інвеставаць з высокім даходам у акцыі, аблігацыі, крыптавалюту, каштоўныя металы, то будзьце пільныя, адхіляйце званкі з такімі прапановамі.

Запытайце незалежнай фінансавай парады, перш чым аддаваць свае сродкі. Вывучыце інфармацыю ў інтэрнэце.

І пры неабходнасці звярніцеся ў міліцыю.

У апошні час пачасціліся выпадкі вішынгу (разнавіднасць тэлефоннага махлярства) з мэтай выманьвання ў трымальнікаў банкаўскіх плацежных картак асабістай інфармацыі, нумара карткі, логіна і пароля ад сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, СМС-кодаў і іншага.

Карыстайцеся інтэрнэт-банкінгам толькі на абароненым камп'ютары з абмежаваным фізічным доступам да яго пабочных асоб

Калі вы выкарыстоўваеце агульнадаступныя камп'ютары, памятайце аб вялікай верагоднасці таго, што даныя вашай плацежнай карткі могуць быць скрадзены падчас пакупак у інтэрнэце.

На такіх камп'ютарах можа быць усталявана праграмнае забеспячэнне для крадзяжу інфармацыі (кейлогеры), якое фіксуе ўсе націсканні на клавішы, у тым ліку нумар вашай карткі і рэгістрацыйныя звесткі.

Акрамя таго, **не выкарыстоўвайце адкрытыя сеткі Wi-Fi пры выкананні плацежных аперацый у інтэрнэце, у тым ліку не заходзьце ў інтэрнэт-банкінг,** нават калі вы карыстаецеся сваім персанальным камп'ютарам ці мабільным тэлефонам.

Да агульнадаступнай сеткі могуць таксама падключацца зламыснікі і перахопліваць інфармацыю падчас яе перадачы.

Не адкрывайце камп'ютарныя файлы ці спасылкі, атрыманыя з ненадзейных крыніц

Не націскайце на падазроныя спасылкі, атрыманыя з пісем электроннай пошты і сацыяльных сетак, асабліва ад незнаёмых адпраўшчыкаў.

Не ўсталёўвайце на мабільныя прылады праграмы з сумнеўных крыніц

Спампоўвайце праграмы толькі з афіцыйных магазінаў (PlayMarket, WindowsPhoneStore, AppStore) і тых крыніц, у надзейнасці якіх вы перакананы.

Пры спампоўванні праграмы з неафіцыйных крыніц праверце перад загрузкай наяўнасць негатыўных водгукаў аб праграме, памылак друку ў апісанні, а таксама звярніце ўвагу на звесткі, якія неабходна перадаць пры ўсталяванні праграмы.

Выкарыстоўвайце апошнія версіі браўзераў. Абнаўляйце антывіруснае ПЗ

Каб быць упэўненым, што ваш камп'ютар або мабільнае прыстасаванне бяспечныя для выканання плацежных аперацый у інтэрнэце, своечасова абнаўляйце браўзеры, а таксама ўсталюйце на вашы прылады аўтарытэтнае антывіруснае праграмнае забеспячэнне.

Заўсёды інфармуйце аб спробах махлярства праваахоўныя органы, нават калі вы не сталі ахвярай падману.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» пастаянна ажыццяўляе пошук і распрацоўку дадатковых мер бяспекі ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, сочыць за тэндэнцыямі ў сферы безнаяўных плацяжоў, а таксама рэгулярна абнаўляе рэкамендацыі па бяспечным выкарыстанні банкаўскіх плацежных картак.

Давайце разам зробім безнаяўныя аперацыі больш бяспечнымі!

Інфармацыя і здымкі атрыманы ад ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр».

УНП 190381773



Расказваем пра ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр»

Банкаўскі працэсінгавы цэнтр пачаў сваю работу ў Мінску ў 2002 годзе.

Ён створаны шэрагам буйных банкаў і прамысловых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь з мэтай шырокага ўкаранення ў краіне безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак і развіцця інфраструктуры абслугоўвання трымальнікаў картак.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» аказвае комплекс паслуг па працэсінгу аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі, у тым ліку аўтарызацыю картачных аперацый, вядзенне ідэнтыфікацыйных баз даных картак, банкаматаў і тэрміналаў, персаналізацыю картак, працэсінг і клірынг аперацый з карткамі плацежных сістэм, што дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама падключэнне і абслугоўванне банкаматаў і тэрміналаў у пунктах продажу.

Усе паслугі, што прапаноўваюцца, сертыфікаваны на поўную адпаведнасць патрабаванням і правілам плацежных сістэм.

ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр» — спецыялізаваны цэнтр па інфармацыйна-тэхналагічным забеспячэнні безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх картак айчыннай плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ і міжнародных сістэм VISA International і MasterCard WorldWide, UnionPay, American Express, што дзейнічаюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Апаратна-праграмны комплекс і вытворчыя памяшканні прадпрыемства адпавядаюць тэхналагічным патрабаванням і правілам бяспекі пры ажыццяўленні фінансавых транзакцый, якія прад'яўляюцца плацёжнымі сістэмамі да працэсінгавых цэнтраў.

Кадравая палітыка цэнтра будуецца ў адпаведнасці са стратэгіяй развіцця прадпрыемства і накіравана на прыцягненне і ўтрыманне высокакваліфікаванага персаналу, на фарміраванне адзінай каманды.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ
Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Продавец: торговое унитарное предприятие «Глубокский магазин оптовой торговли», Витебская обл., г. Глубокое, ул. Полевая, 24, 8(02156)2-80-02

Лот №1. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-15605, площадью – 537,7 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н. г. Глубокое, ул. Полевая, 24, наименование: одноэтажное кирпичное здание магазина оптовой и комиссионной торговли, назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, составные части и принадлежности: пристройка, сарай. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-27516, площадью – 79,6 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Полевая, 24/1, наименование – гараж, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 221550100001000306 (право постоянного пользования). **Начальная цена:** 65 462,20 бел. руб. без НДС. Задаток: 6 546,22 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 26.06.2019 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 27.05.2019 с 8.30 по 25.06.2019 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке объектов продажи, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 07.02.2019, 09.04.2019

Продавец: ОАО «Витебскоблресурсы» Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, дом 193А, 8(0212) 65-71-98

Лот №1. Кран ж/д КДЭ 163, 1977 г. в., инв. № 039. **Начальная цена:** 33 120,00 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 312,00 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 26.06.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 27.05.2019 с 8.30 по 25.06.2019 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке объекта продажи. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 09.04.2019

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ОАО «Трест Белстроммонт» (УНП 100135597) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 (17) 395-58-91.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **10 июня 2019 г. 09.00-17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Срок подачи заявок и оплаты задатка по 07.06.2019 г. 17:00. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 16.04.2019 г.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Станок токарно-винторезный	1 512,00
2	Станок фуговальный	554,40
3	Станок лесопильный	316,80

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **25 июня 2019 г. 09.00—17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Срок подачи заявок и оплаты задатка по 24.06.2019 г. 17.00.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб., с НДС
1	Станок металлорежущий (токарный) + патрон токарный 3-250.35.14В ф 250	3 720,00
2	Веерная щитовая опалубка колонн системы Н=3,0 м	9 360,00
3	Веерная щитовая опалубка колонн системы Н=3,3 м	10 200,00
4	Опалубка монолитного перекрытия	14 280,00
5	Вагон-бытовка (инв. № 14)	3 360,00
6	Вагон-бытовка (инв. № 724)	3 960,00
7	Вагон-бытовка (инв. № 791)	2 520,00
8	Вагон-бытовка (инв. № 418)	1 560,00
9	Вагон-бытовка (инв. № 731)	2 880,00
10	Вагон-бытовка (инв. № 423)	3 960,00
11	Трансформатор (РФ) для подогрева бетона ТСДЗ-63/0.38УЗ + провод ПНСВ 1,2 ч	1 680,00
12	Станок СР-36	3 000,00

Местонахождение – г. Гомель, ул. Пригородная, 31, тел. для ознакомления +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) далее – подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи

Извещение о проведении 7 июня 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	«Здание специализированное для общественного питания» с инвентарным номером 500/С-25880 общей площадью 336,1 кв. м
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Олега Кошевого, 13а
Сведения о земельном участке	Площадь – 0,0232 га, кадастровый номер 500000000001001873, назначение – земельный участок для обслуживания здания специализированного для общественного питания
Продавец имущества	ОАО «МТЗ», ул. Долгобродская, 29, 220070, г. Минск
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	337 000,00 бел. руб.
Сумма задатка	60 000,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов (покупатель) обязан согласовать дальнейшее использование приобретенного капитального строения с Минским городским исполнительным комитетом.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **7 июня 2019 года в 10.00 по адресу:** г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 28.05.2019 г. по 05.06.2019 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»)

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Слуцк-Модуль» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже комплекса имущества в составе

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв. м
	Объекты недвижимости		
1	Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101	640/С-84380	10378,5
2	Тепловые сети, инв. № 98342, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р -н, ул.14 Партизан, 101	640/С-84368	-
3	Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р -н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84443	1612,5
4	Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101	640/С-84378	783,6
5	Трансформаторная подстанция, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р -н, ул.14 Партизан, 101/16	640/С-84444	37,7
6	Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101	640/С-84373	-
7	Канализационная насосная станция (инв. № 98330), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101/24	640/С-84377	25,2
8	Эстакада-площадка для мойки автомобилей, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84445	-
9	Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84371	-
10	Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101	640/С-84365	-
11	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84372	-
12	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84367	-
13	Контрольно-пропускной пункт, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/4	640/С-84440	8,1
14	Склад газовых баллонов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/10	640/С-84442	107,8
15	Вспомогательный корпус (часть), инв. № 98358, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/12	640/С-84381	1353,6
16	Объекты благоустройства, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84370	-
17	Главный корпус, инв. № 98319, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/23	640/С-84382	22590,0
18	Здание вспомогательного корпуса, инв. № 98360, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/13	640/С-51701	335,7
19	Склад тяжелых металлов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/22	640/С-39784	634,6
20	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/8	640/С-38241	535,9
21	Производственное здание — котельная, инв .№ 98361, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/21	640/С-51700	194,3
22	Гараж со вспомогательным корпусом, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/3	640/С-47756	1362,3
23	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/18	640/С-38242	2467,1
24	Здание информационно-вычислительного центра, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/1	640/С-38243	2393,6
25	Автомонтажный корпус, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул.14 Партизан, 101/19	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/7	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84379	-
	Оборудование		
28	Кран мостовой электрический 16-5К-16,5-12У3, заводской № 147, инв. № по бух. учету 97097		
29	Кран мостовой электрический, заводской № 863, инв. № по бух. учету 98366		
30	Электростанция (дизель-генератор) ДГМА 48М2, заводской № 707796, инв. № по бух. учету 40300		
31	Трансформатор ТМЗ-1000/10-84У1, заводской №250542, инв. № по бух. учету 8873		
32	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской №341442, инв. № по бух. учету 8875		
33	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской №341321, инв. № по бух. учету 8874		
34	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской №351297, инв. № по бух. учету 8516		
35	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81У3), инв. № по бух. учету 8868		
36	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81У3), инв. № по бух. учету 8869		
37	Трансформаторная подстанция КТП-3 (КТП-1000/10/0,4-81У3), инв. № по бух. учету 8522		
38	Трансформаторная подстанция КТП-4 (2КТП-1000-10-81У3), инв. № по бух. учету 8344		
39	Трансформаторная подстанция КТП-5 (2КТП-1000-10-81У3), инв. № по бух. учету 8866		
40	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81У3), инв. № по бух. учету 8867		
41	Трансформаторная подстанция КТП-2 (КТП-1000/10/0,4-81У3), инв. № по бух. учету 7987		
42	Трансформаторная подстанция КТП-7 (КТП-630/10/0,4-84У3), инв. № по бух. учету 8870		

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** с кадастровым номером 624650100001006603 (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га.

Объекты недвижимости сдаются в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 510 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **351 000,00 бел. руб.**). Стоимость снижена на **55 %.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие – «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос.регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ.лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ.лица, индивидуального предпринимателя, юр.лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объектов производится с рассрочкой с внесением платежей в следующем порядке:

1-й платеж: оплата 30 (тридцати) процентов стоимости имущества производится в срок до 31.07.2019 (в первоначальный платеж сумма задатка не входит);

2-й платеж: оплата 15 (пятнадцати) процентов стоимости имущества производится в срок до 01.09.2019;

оставшаяся сумма оплачивается равными долями в течение 8 (восьми) календарных месяцев с внесением платежей не позднее 20 (двадцатого) числа каждого месяца начиная с сентября 2019.

В договоре купли-продажи могут быть предусмотрены иные сроки оплаты объектов.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

При недостижении согласия между продавцом и покупателем имущества по форме и содержанию договора купли-продажи имущества указанный договор подписывается по форме, утвержденной ликвидационной комиссией.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 19.02.2019.

Аукцион состоится **01.07.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.06.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже магазина в г. Смоленск, принадлежащего ОАО «Белстройматериалы»

Лот № 1: Здание магазина Торгового дома «Стройкомплект», инв. № 1988. Г. п. – 1970. Площадь – 1039,1 кв. м. Адрес: Российская Федерация, Смоленская обл., г. Смоленск, ул. Академика Петрова, 9А. **Земельный участок:** Земельный участок площадью 1405 кв. м с кадастровым номером 67:27:0020502:4, находящийся у ОАО «Белстройматериалы» на праве аренды. **Обременение:** Аренда (перечень, сдаваемых в аренду площадей содержится на сайте Организатора аукциона ino.by). **Начальная цена с НДС –** 28 086 000,00 рос. руб. **Задаток –** 2 808 600,00 рос. руб. **Шаг аукциона –** 5 %.

Условия аукциона: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с момента проведения аукциона. 2. Оплатить Продавцу 100 % стоимости объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи объекта. 3. Передача Объекта осуществляется Продавцом в течение 10 (десяти) календарных дней со дня оплаты Победителем аукциона 100 % стоимости объекта путем подписания Сторонами акта приема-передачи объекта. 4. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % с учетом НДС – 20 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 27.06.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «Белстройматериалы», г. Минск, пр. Партизанский, 99а. Тел. 8(017) 296-35-94. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.

Задаток для резидентов Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Задаток для нерезидентов Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002 г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 27.06.2019 (ОАО «Белстроймаериалы», Лот № 1). Срок внесения задатка: в рос. руб. – по 19.06.2019; в бел. руб. – по 26.06.2019 до 11.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 26.06.2019 в 12.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Кормильцева Тамара Ивановна, тел.: +74812657322, +7908 283 64 02.

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 29 мая 2019 года открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности ***(опубликовано в газете «ЗВЯЗДА» 26.04.2019):***

- предмет аукциона № 8 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

Телефон для справок +375 (17) 327-40-22. Адрес в интернете: www.mgcn.by.

УНП 190398583

РУП «Торговый дом «Восточный»
извещает о проведении 26.06.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-52197, общей площадью 2737,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Белорусская, д. 6А. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000300 площадью 0,7308 га. **Начальная цена продажи – 1 236 600,00 рублей, задаток – 123 660,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Изолированное помещение с инвентарным номером 330/D-43412, общей площадью 33,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырь, ул. Гагарина, 89/6-258, ГПК «Галит-1». Назначение: помещение транспортного назначения, наименование – гараж № 258. **Начальная цена продажи – 11 466,00 рублей, задаток – 1146,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-75779, общей площадью 37,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Хатаевича, ГСК-17, гараж № 302. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: кирпичный гараж №302. Составные части и принадлежности: подвал. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000151. **Начальная цена продажи – 10 260,00 рублей, задаток – 1026,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Незарегистрированное капитальное строение общей площадью 29,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Мясотский с/с, СТ «Дачные Плесы», 15/5. Назначение: садовый, дачный домик (дача), составные части и принадлежности: дощатая уборная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623882700027000170 площадью 0,0564 га. **Начальная цена продажи – 7290,00 рублей, задаток – 729,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 614/С-17497, общей площадью 30,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Солнечное-08», д. 112. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый домик, составные части и принадлежности: пристройка, сарай, уборная. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624882000020000055 площадью 0,0473 га. **Начальная цена продажи – 11 340,00 рублей, задаток – 1 134,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-141305, общей площадью 94,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-1. Назначение: производственное помещение, наименование: производственное помещение, в том числе составные части и принадлежности: проезжая часть-площадь – 15,1 кв. м, пешеходная часть участок 1 – площадь – 29,6 кв. м, участок 2 – площадь – 14,4 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га. **Начальная цена продажи – 110 880,00 рублей, задаток – 11 088,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-179520, общей площадью 8,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-19. Назначение: административное помещение, наименование: административное помещение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га. **Начальная цена продажи – 8 280,00 рублей, задаток – 828,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-179521, общей площадью 15,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-20. Назначение: складское помещение, наименование: склад, в том числе составные части и принадлежности: проезжая часть – площадь – 25,4 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га. **Начальная цена продажи – 10 980,00 рублей, задаток – 1 098,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29025, общей площадью 362,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. Назначение: здание нежилое, наименование: здание модуля гальваноочистки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 243500000003000075 площадью 10,6066. **Начальная цена продажи – 30 348,00 рублей, задаток – 3 034,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29028, общей площадью 510,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: здание компрессорной станции. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 243500000003000075 площадью 10,6066. **Начальная цена продажи – 51 516,00 рублей, задаток – 5 151,60 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000004005112 площадью 4,6322 га, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 102. **Начальная цена продажи – 3 342 600,00 рублей, задаток – 334 260,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25471, общей площадью 302,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 228/16. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631. **Начальная цена продажи – 58 212,00 рублей, задаток – 5 821,20 рублей. Шаг аукциона – 5%.**

Лот № 13. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25478, общей площадью 193,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 228/15. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631. **Начальная цена продажи – 37 800,00 рублей, задаток – 3 780,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25489, общей площадью 1085,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 228/2. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631. **Начальная цена продажи – 244 080,00 рублей, задаток – 24 408,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25482, общей площадью 136,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 228/14. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631. **Начальная цена продажи – 26 892,00 рублей, задаток – 2 689,20 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

УСЛОВИЯ

1.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 18 (460)

ЛУПА ДАПАМОЖА

Разгледзець у падрабязнасцях літаграфіі сусветна вядомага французскага графіка XIX стагоддзя Поля Гюстава Дарэ.

Гледачы на выстаўцы Гюстава Дарэ.

Праект «Шэдэўры Гюстава Дарэ» ўпершыню прадстаўлены ў Беларусі. Яго арганізатарам з'яўляецца кампанія «Артгіт» з Масквы.

— Звычайна Дарэ ведаюць як ілюстратара Бібліі, але ж ён быў вельмі разнастайным не толькі ў тэхніках, якімі дасканала валодаў, але і ў выбары літаратурных твораў, малюнкі да якіх ствараў, — расказвае **дырэктар гомельскай мастацкай галерэі Гаўрылы Вашчанкі Людміла ШЫМБАЛЁВА.** — У Гомелі прадстаўлены 126 работ да сусветна вядомых кніг. У чорна-белых літаграфіях ажываюць «Страчаны рай» Мільтана, «Боская камедыя» Дантэ, «Мудрагелісты ідальга Дон Кіхот Ламанчскі» Сервантэса, «Прыгоды барона Мюнхгаўзена» Распэ, байкі Лафантэна, «Чароўныя казкі» Перо.

Воўк, які пераапрануўся ў бабулю. Ілюстрацыя да казкі Ш. Перо «Чырвоная Шапачка».

Між тым самы вялікі ілюстратар XIX стагоддзя вучыўся маляваць самастойна. Ён так і не атрымаў акадэмічную адукацыю. Пры гэтым прафесійную кар'еру мастака Поль Гюстаў Дарэ пачаў у 15 гадоў. У гэтым узросце ён заключыў свой першы кантракт з выдавецтвам. Ён маляваў афішы, публікаваў у часопісах літаграфіі, а пазней звярнуўся да кніжнай ілюстрацыі, якая прынесла яму самую вялікую папулярнасць.

Галоўны захавальнік фондаў Алег Курашоў праводзіць экскурсію па трох залах галерэі і абавязкова прапануе ўсім лупу — каб пабачылі, якім чынам з дапамогай сціплых графічных сродкаў мастак перадаваў святлацені, тонавыя ўзаемаадносіны тонаў, прастору і перспектыву:

— Сапраўды цікава прыблізіць выяву і разгледзець яе падрабязна. У Дарэ часта не бачна крыніца святла, але глядач яго бачыць. Ведаеце, за два гады ён стварыў 250 ілюстрацый да Бібліі ў тэхніцы літаграфіі. На працягу 40 гадоў творчай дзейнасці яго ілюстрацыі выдаваліся практычна штотыднёва. Пладавітасць Дарэ арганічна спалучаецца з іскрыстым уяўленнем і тэхнічнымі навыкамі. Да яго ніхто не мог надаць гравюры такую дзіўную і кранальную ступень маляўнічасці.

Талент Дарэ яшчэ пры жыцці (а пражыў ён толькі 51 год) перасек межы роднай Францыі. Выдаўцы змагаліся за права першымі займець ілюстрацыі Дарэ да кніг, якія рыхтаваліся да выдання. Ён стварыў дзясяткі тысяч работ, і кожная з іх уваходзіць у залаты фонд сусветнай мастацкай спадчыны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

На сцэне

Усе вашы праблемы вырашыць Трыкстэр

Спектакль, дзе «маладзёжны» значыць «інфантыльны»

Як ні дзіўна, на прэм'еры «містычнай камедыі» «Трыкстэр клуб» Маладзёжнага тэатра самым смешным жартам публіцы падаўся выраз «Тваю маць». Хаця нядзіўна: у своеасаблівым сегменце глядацкіх спектакляў, як, уласна, і ў любым, сцэна і публіка адно аднога ўзаемадапаўняюць: прымітыўны гумар, эротыка, шаблонныя персанажы, утрыраваная акцёрская ігра, тэндэнцыя на спрашчэнне добра заходзяць аматарам танных пацех. Знаходзішся ты ў тэатры з пілястрамі і калонамі альбо сядзіш на канапе перад тэлевізарам — усё адно. Прэм'ера «Трыкстэр клуба» Андрэя Гузія па п'есе сучаснага беларускага драматурга Улады Альхоўскай адбылася 14 мая і дала магчымасць, седзячы ў тэатры, паглядзець гумарыстычную тэлевізійную п'есу.

Нават сюжэтны матыў самога спектакля стаў цудоўнай метафарай такога тэатральнага кантэнту, маўляў, чым прасцей ставіцца да складаных рэчаў, тым весялей жыць. У цела галоўнага героя — Псіхолага — усяляецца Трыкстэр, то-бок дух хітрунства і падману (гэта яшчэ і распаўсюджаны ў мастацтве вобраз; самы, напэўна, вядомы прыклад — Джэк Верабей), і пачынае замест сваёй сур'ёзнай і спагадлівай ахвяры лячыць людзей.

Рэжысура спектакля абмяжоўваецца тым, што паварочвае кола на сцэне, мяняе галоўных выступоўцаў і час ад часу застаўляе герояў перамяшчацца па дзіўнай формы канструкцыі ў цэнтры.

З дапамогай звышнатуральных здольнасцяў ён выкрывае быццам сапраўдныя праблемы і матывы трох пацыентаў і пачынае з імі гуляцца. Кожны з наведвальнікаў вяртаецца да дзіўнага псіхолага(ў) зноў і ў выніку праз пэўныя выпрабаванні альбо прыніжэнні робіцца значна шчаслівейшы. Атрымліваецца не псіхалагічная, а практычная дапамога: аказалася, што дыягназы герояў — фікцыя, а насамрэч ім патрэбна было толькі наладжанае асабістае жыццё, у чым Трыкстэр ім і дапамог.

То-бок, не варта ісці праз церні ўнутраных праблем чалавека: у такую складаную сферу, як псіхалогія, можа без цырымоній уварвацца нейкі дух, каб усё паставіць пад сумнеў і сваімі метадамі прывесці пацыентаў да хэпіэнду. Ізноў вяртаемся да асноватворнага прынцыпу «Трыкстэр клуба» як метафары такога кшталту тэатра: чым прасцей, тым лепш.

Чаго не адымеш у спектакля Андрэя Гузія, дык пераканаўчай мастацкай умоўнасці, якая дазваляе не карабаціцца ад сэнсавых ланцужкоў. Пастаноўка падладжваецца пад свайго хітрага галоўнага героя — яна вольна выкарыстоўвае прастору і выходзіць за межы сцэны, у якасці дэкарацый мае кідкую і нефункцыянальную канструкцыю ў цэнтры, па якой зрэдку скачуць акцёры, апранае Трыкстэра ў экстравагантны касцюм і дае яму ў рукі магічную палку. І, нарэшце, уяўляецца ненатуральнай, дзіўнай — адным словам, казачнай.

Вядома, і псіхолаг тут наўрад ці псіхолаг (да такога варта прыходзіць, каб цябе запэўнілі ў тым, у што ты хочаш верыць), і пацыенты наўрад ці рэалістычныя, і праблемы ў іх бязглуздыя. Уласна кожны з персанажаў праз пазбаўленне ад натуральных характарыстык губляе і сувязь з рэальным светам.

Абраны мастацкі метад — адно, а яго начыненне, што ў гэтым выпадку нагадвае нічым не абцяжараную дзіцячую фантазію, — зусім іншае. Увогуле, даць магчымасць звышнатуральнаму духу свавольнічаць замест звычайнага чалавека, прычым з жартамі і непрадказальным вынікам, — цудоўная ідэя для забаўляльнай пастаноўкі. Згадзіцеся, такі анонс прыцягнуў бы вашу як гледача ўвагу. Але ў гэтым выпадку нястыльныя кур'ёзы, што мяркуюцца быць смешнымі, смех выклікаюць наўрад ці (у чым, магчыма, і сакрэт поспеху выразу «Тваю маць»: больш амаль не было з чаго смяяцца). Першая пацыентка, якая любіць паскардзіцца на жыццё, ператвараецца ў расліну. Муж другой пацыенткі, што падымаў на яе руку, становіцца нябачным і праз назіранне за сваёй жонкай мяняе сваё да яе стаўленне. Трэці наведвальнік — журналіст — аказваецца здольным толькі на кулінарныя артыкулы і губляе сваю фанабэрыю. Першая пацыентка пачынае стасункі з трэцім, а сямейная пара наладжвае сваё жыццё — псіхолаг на такое, вядома ж, не здольны.

Рэжысура спектакля абмяжоўваецца тым, што паварочвае кола на сцэне, мяняе галоўных выступоўцаў і час ад часу застаўляе герояў перамяшчацца па дзіўнай формы канструкцыі ў цэнтры. Асобнае месца займаюць перапалкі Псіхолага з залы з Трыкстэрам на сцэне альбо наадварот: такія ж нефункцыянальныя, як і шмат што ў гэтым спектаклі, дзе вынік і сэнс прадказальныя, яны ўсё ж перыядычна гучаць і прымушаюць гледача сябе перачэкваць.

Усё следаванне формулам вянчае архаічная падкрэсленая акцёрская ігра, хаця зноў жа ў «містычнай камедыі» яна, можа, выглядае арганічна і разам з дэкарацыямі, гукамі, лішнімі і непрадуманымі элементамі, простай рэжысурай і простым усім стварае адно зразумелае цэлае.

За вышукамі сучаснага беларускага тэатра сапраўды цікава назіраць: пакуль адны аўтары прадстаўляюць свае эксперыментальныя формы і аўтарскі стыль, іншыя — спосабы завабіць у тэатральны палац цяжкадасяжнага гледача. «Трыкстэр клуб» у справе апошняга выкарыстаў усе пералічаныя вышэй сродкі, праўда, з такой наіўнасцю і непасрэднасцю, што наўрад ці і сам зразумеў, наколькі «маладзёжны» тэатр з ім апраўдаў сваю назву. Пастаноўка, што, здаецца, ставілася дзеля забавы, з казачнай мараллю і неабавязковымі сэнсамі, з'ехала ў мастацкі інфантылізм, але зноў жа шчыры. Спектакль разлічаны на гледача, каб ён ацаніў прыстасоўванне да яго нежаданняабцяжарвацца, але атрымаўся такі, што глядач калі і хмыкне два разы, ужо будзе добра.

У выпадку з «Трыкстэр клубам» варта адзначыць вельмі важны, калі не вызначальны, факт работы з беларускай драматургіяй. Толькі будучыня яе дакладна не ў спрашчэнні навакольля.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

Нотны радок

ЧАРГОВЫ ЭКСКЛЮЗІЎНЫ

Яшчэ адзін канцэрт класічнай музыкі прысвяціў сябе Манюшку

Шматгадовы дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнай філармоніі ў Варшаве, уладальнік прэміі «Грэмі» маэстра Антоні Віт прыехаў у Мінск, каб стаць дырыжорам на канцэрце, прысвечаным 200-годдзю Станіслава Манюшкі, класіка беларускай і польскай музыкі.

Хацелася сказаць — чарговым канцэрце: з нагоды юбілею кампазітара апошнім часам у нас праходзіць мноства «рознажанравых» мерапрыемстваў, — але не, праграму, што была прадстаўлена ў дзяржаўнай філармоніі 23 мая, будзем лічыць асаблівай. У двух аддзяленнях Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі (галоўны дырыжор — народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў) і салісты паспелі ахапіць і Манюшку, і Людвіга ван Бетховена.

Тут былі выкананы арыі з опер «Галька» і «Страшны двор», уверцюра з оперы «Парыя» і музыка з оперы «Графіня» Манюшкі, а Бах загучаў сваёй 7-й сімфоніяй.

5 мая Станіславу Манюшку споўнілася дзвесце гадоў. Юбілей кампазітара, што нарадзіўся на Міншчыне, стварыў оперу «Сялянка» на беларускай і польскай мовах (была забаронена ў Мінску), апроч іншага, вучыўся ў Берліне, арганізаваў аркестр у Вільні, пераехаў у Варшаву, дзе стаў галоўным дырыжорам польскай оперы ў Вялікім тэатры і, нарэшце, зрабіў вялікі ўклад у музыку, поўнамаштабна адзначаецца ў некалькіх краінах. У Польшчы і Літве 2019-ы аб'яўлены годам Манюшкі. У Беларусі адна за адной праходзяць прысвечаныя класіку імпрэзы.

Антоні Віт, кавалер Камандорскага Крыжа Адраджэння Польшчы і ордэна Французскага Ганаровага легіёна, які паўдзельнічаў у запісе больш як двухсот дыскаў для прэстыжных гуказапісвальных кампаній і з'яўляецца адным з самых значных польскіх дырыжораў, на канцэрце стаў не адзіным госцем з Польшчы. Салісткай праграмы выступіла беларуска Ірына Крыкунова, а мужчынскія оперныя партыі выканаў польскі тэнар Рафал Бартміньскі.

Канцэрт арганізаваны Польскім інстытутам сумесна з аркестрам як частка святкавання Года Станіслава Манюшкі. Нагадваем, што ў Мінску і Смілавічах 30 і 31 мая пройдзе яшчэ адно прысвечанае юбілею мерапрыемства — навукова-практычны форум «Мастацкая прастора Еўропы XIX—XX стагоддзяў і Станіслаў Манюшка: гісторыя, сучасны стан», што мае адкрыць пра кампазітара нам пакуль невядомае.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

Арт

ПА ТОЙ БОК СЛАВЫ

Выстаўка Эмі Уайнхаус прыедзе ў Мінск

Экспазіцыю Amy Winehouse — A Family Portrait сусветна вядомай спявачкі з беларускімі каранямі прывязуць у нашу сталіцу. У апошнія дні красавіка на краўдфандынгавай пляцоўцы Ulej.by стартавала кампанія па зборы сродкаў на арганізацыю гэтай выстаўкі. Грошы сабралі, таму выстаўка прыедзе ў нашу краіну ўжо ў чэрвені.

Экспазіцыя, прысвечаная паходжанню і жыццю шасцікратнай уладальніцы «Грэмі» і адной з самых яркіх артыстак пачатку XXI стагоддзя Эмі Уайнхаус, упершыню была прадстаўлена шырокай публіцы Яўрэйскім музеем Лондана ў 2013 годзе. У той год якраз гэта выстаўка, уявіце толькі, павялічыла наведвальнасць музея на 300 працэнтаў! Пазней яна была паказана ў Сан-Францыска, Вене, Тэль-Авіве, Амстэрдаме, Мельбурне і іншых культурных цэнтрах свету, і паўсюдна мела поспех.

...Сама спявачка памерла ў 2011-м ва ўзросце 27 гадоў, а яе музыка працягвае знаходзіць водгук у сэрцах мільёнаў слухачоў па ўсім свеце. Аднак многія прыхільнікі нават не падазраюць, што іх кумір вядзе свой радавод з Беларусі, адкуль сям'я пераехала ў Лондан тры пакаленні таму. Прапрадзед Эмі эміграваў разам з роднымі ў канцы XIX стагоддзя і больш ніколі не вяртаўся на радзіму, але перадаў сваёй унучцы Сінціі любоў да музыкі, а тая, у сваю чаргу, шчодра падзялілася талентам ужо са сваёй унучкай Эмі, таму многія фотаздымкі на сямейнай выстаўцы распавядаюць менавіта пра іх стасункі.

Складальнікі экспазіцыі падрабязна даследавалі паходжанне Эмі, каб паказаць важнасць сямейных стасункаў, пераемнасці культурнай спадчыны праз пакаленні і памяці пра свае карані. Вялікую дапамогу ў гэтым аказаў брат спявачкі Алекс, які хацеў расказаць пра Уайнхаус — не толькі музычную зорку і бунтарку, а горача любімую сястру. Так, сям'я з падачы Алекса перадала ў музей асабістыя рэчы спявачкі, якія адлюстроўваюць гісторыю яе дзяцінства і юнацтва, любовы да музыкі, моды і роднага горада: гэта ўнікальныя сямейныя здымкі, гітары, пласцінкі, статуэткі «Грэмі» і калекцыя адзення, а таксама вялікае генеалагічнае дрэва.

У Мінску правядзенне выстаўкі ініцыюе Гётэ-інстытут сумесна з Цэнтрам беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны і пасольствам Вялікабрытаніі ў Беларусі, пры падтрымцы пасольства Ізраіля ў нашай краіне.

«Для нас вельмі важна, што менавіта Мінск можа стаць наступным горадам, які прыме праект, — адзначае заснавальніца Цэнтра беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны Мая Кацнельсон. — Гэта вельмі шчырая сямейная гісторыя, якая раскрывае вядомую асобу з зусім нечаканага боку. І вельмі каштоўна тое, што дзякуючы праекту сям'я Эмі зможа ўпершыню прыехаць на сваю гістарычную радзіму. Для Беларусі ж гэта выдатная магчымасць умацаваць свой імідж як удзельніка сусветнага культурнага працэсу».

Як плануецца, Мінск стане апошнім горадам свету, дзе будзе паказана экспазіцыя Amy Winehouse — A Family Portrait. Пасля заканчэння выстаўкі яе расфарміруюць і вернуць экспанаты сям'і спявачкі і іншым уладальнікам.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота перададзена сям'ёй Уайнхаус і Яўрэйскім музеем Лондана.

Трансфармацыі

ІРАНІЧНЫ ТРАГІЗМ ЛЯЛЯЎСКАГА

Высокі стыль Аляксандра Пушкіна ў рэчышчы лялечнага тэатра

Нам гэта ўжо знаёма: быццам сярэднявечная, загадкавая, змрочная атмасфера і сюжэты, якімі яна кіруе. Уся ўвага на сцэну і яе мудрагелістыя формы: гэтым разам Аляксей Ляляўскі заснаваў свой спектакль на Пушкіне і яго «Маленькіх трагедыях». Трагедыя на фоне, трагедыя на сцэне, трагедыя ў паветры, трагедыя ў галасах і страсцях, якім паддаюцца галоўныя героі. Гэта «Скупы рыцар», «Моцарт і Сальеры», «Каменны госць» і «Баль падчас чумы», што транслююць чатыры грахі, кожны з якіх абыгрываецца ў той жа «манастырскай» атмасферы, але кожны раз па-іншаму, і завяршаецца ўсё пікавым маналогам.

На прэм'еры новай пастаноўкі Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек — яна называецца «Пушкін. Вельмі маленькія трагедыі» — побач са мной сядзела паклонніца ці то «Маленькіх трагедый», ці то Аляксандра Сяргеевіча, і амплітуда яе эмоцый стала для мяне асобным спектаклем. У першыя хвіліны яна была шчаслівая, а ў выніку, калі Ляляўскі засланіў Пушкіна, а акцёры прачыталі нешта не па тэксце, засталася бурна расчараваная. Публіка часта ўсё яшчэ аказваецца непадрыхтаваная да таго, што тэатр можа выйсці за рамкі падрадковага ўвасаблення літаратурнага твора, хаця менавіта сваімі варыяцыямі ён і цікавы, па іх сюды і варта ісці.

Таму пра пастаноўку «Пушкін. Вельмі маленькія трагедыі» тым, хто не ведае Аляксея Ляляўскага і славу нашага лялечнага тэатра, трэба ў першую чаргу сказаць, што на гэтай сцэне Пушкін — вось кашчунства — другасны (а першасны Ляляўскі — галоўны рэжысёр тэатра лялек і, можна сказаць, культавы беларускі тэатральны аўтар, праца якога адзначылася таксама ў Расіі, Германіі, Польшчы, Бельгіі, Фінляндыі, Нідэрландах).

Класік і сам пазычыў сюжэты сваіх трагедый, затое як аформіў! Пастаноўка лялечнага таксама пазычае пушкінскія трагедыі, якія на сцэне ўзбагачае праз стыльныя, кантрасныя і стракатыя выяўленчыя сродкі. Гэта незвычайна, гэта не дакладная чытка тэксту, гэта не рэверанс у бок Пушкіна, гэта — сапраўдны тэатр. Прычым трагедыі ў ім сталі яшчэ больш трагічныя, прынамсі, яны займаюць больш фізічнай і сэнсавай прасторы.

Паўсюль тут ёсць пэўная іронія: пушыстыя Барон і Альбер, кантрасты паміж высокім тэкстам і, напрыклад, недалікатнай эратычнай сцэнай, Старшыня ў футры і Малады чалавек у кажуху, напышлівасць і вылучанасць апошняй прамовы.

Дык вось, папулярныя матывы атрымліваюць сваё афармленне, сваіх лялек і свой грэх. Скупы барон, які чахне над багаццем і пакідае сыну хадзіць быццам жабрак; Сальеры, што зайздросціць генію Моцарта і чыніць «цяжкі доўг» пазбавіць

Фота Станіслава ВІДГОРЧЫКА.

ад яго свет (напэўна, самы распаўсюджаны міф, народжаны дзякуючы Пушкіну); Дон Гуан, што кахае жонку забітага ім Камандора, і Старшыня, які падчас эпідэміі чумы страціў маці і жонку, а цяпер паддаецца распусным балям. Паўсюль страсці, смерці і трагедыі, адчуванне якіх у спектаклі сыходзіць больш не з сюжэта, а з выбудаванага мастацкага свету.

Ну, было б цяжка ўразіць атрутай, адыходам у іншае жыццё, жалем і іншым, бо ўсе апісаныя Пушкіным гісторыі гледачу вядомыя і вынікі прадказальныя. У «Вельмі маленькіх трагедыях» куды важней паддацца галасам у прыглушаным асвятленні, і драмы распаўсюдзяцца па сцэне і паўстануць у вельмі своеасаблівым рэчышчы. Паўсюль тут ёсць пэўная іронія: пушыстыя Барон і Альбер, кантрасты паміж высокім тэкстам і, напрыклад, недалікатнай эратычнай сцэнай, Старшыня ў футры і Малады чалавек у кажуху, напышлівасць і вылучанасць апошняй прамовы. Лялечны тэатр сам па сабе дае аснову для супярэчнасцяў і своеасабліва трансфармуе класічны тэкст. Гэтымі здольнасцямі распараджаюцца тут з прыемнай вольнасцю — праз лялек, пад'ёмныя механізмы і просты, у сэнсе няхітры, рэквізіт. Канешне, такая вольнасць можа збянтэжыць аматараў пушкінскага высокага стылю.

Прастора ўсё больш і больш запаўняецца: ад аскетычнага асяроддзя скупога барона і яго няшчаснага сына да пышнага балю падчас чумы. Крок за крокам на сцэне з'яўляецца ўсё больш матэрыяльных рэчаў, а месца лялек праз ляльку, невыпадкова ўжо чалавечага памеру, займаюць акцёры.

Публіка часта ўсё яшчэ аказваецца непадрыхтаванай да таго, што тэатр можа выйсці за рамкі падрадковага ўвасаблення літаратурнага твора.

Дзіўна, але з такім як бы хаосам і несістэмнасцю ў жанру з'яўляецца больш інструментаў і механізмаў уплыву: перад гледачом не проста паўстае цёмнае і далёкае стагоддзе, тут усё становіцца яго ўвасабленнем, адпаведна і ўвасабленнем граху, назва якога выбіваецца праекцыяй, адпаведна і ўвасабленнем трагедыі. То-бок, трагедыя — гэта не смерць, не адзінкавая падзея, а літаральна ўсё: наваколле, страсці, чалавечая натура, схільнасць да граху і ланцужок падзей, што заканчваецца так ці інакш.

Таму змрочна-іранічны спектакль па Пушкіну пераасэнсоўвае саму матэрыю з'явы і прадстаўляецца ў вельмі пікантным, поўным аўтарскіх сімвалаў і вынаходак, выглядзе. Такі Пушкін нам да смаку.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

КАБ МІНСК СТАЎ ЗРУЧНЫМ ДЛЯ ЎСІХ

Аб безбар'ерным асяроддзі ў паліклініках і бальніцах

На сёння ў сталіцы вядзецца праектаванне і будаўніцтва пяці новых паліклінік. На ўсіх новых аб'ектах стварэнне безбар'ернага асяроддзя прадугледжана праектамі. Што датычыцца пабудаваных раней, то абсталяванне элементамі безбар'ернага асяроддзя адбываецца пры капітальным рамонце, асобныя элементы могуць быць укаранёныя і падчас бягучага ўтрымання аб'ектаў. У 2018 годзе такія работы выкананы ў дзевяці сталічных установах аховы здароўя.

Прычым безбар'ернае асяроддзе — гэта не толькі пандусы і нізкія бардзюры, адзначыла Жанна Рамановіч. Гэта паняцце значна шырэйшае і датычыцца не толькі інвалідаў-калясачнікаў, але і людзей са слабым зрокам і слыхам, людзей з часовай непрацаздольнасцю, цяжарных жанчын, мам з каляскамі, падлеткаў з роварамі, пажылых людзей. Таму ў паліклініках ствараюцца інфармацыйныя даведнікі, дубляваныя шрыфтам Брайля. Ліфты некаторых установаў аснашчаюцца гукавым апавяшчэннем. На сайтах паліклінік створаны версіі для пацыентаў са слабым зрокам, для тых, хто слаба чуе, выкарыстоўваецца СМС-абвестка.

Наколькі даступныя сталічныя гасцініцы і транспарт?

Усе гасцініцы Мінска, па словах старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, абсталяваныя пандусамі і поручнямі, ва ўсіх маюцца паркоўкі для аўтамабіляў інвалідаў-калясачнікаў, прычым месцы на іх размяшчаюцца ў непасрэднай блізкасці ад увахода ў гатэль. У 26 гасцініцах з 51-й абсталяваны 53 нумары для інвалідаў-калясачнікаў. Каэфіцыент іх выкарыстання склаў 0,74 %.

80 % наземнага гарадскога транспарту Мінска з'яўляецца нізкапольным, г. зн. прыстасаваным для людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Найбольш непрыстасаванымі аказаліся трамваі: толькі 5 (ці 3,6 %) са 137 аснашчаны апарэлямі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску цяпер жывуць больш як 124,7 тысячы людзей з інваліднасцю (6,3 % ад агульнай колькасці жыхароў сталіцы), у тым ліку дзяцей-інвалідаў — звыш 6,9 тысячы, інвалідаў-калясачнікаў — больш за 4,4 тысячы чалавек.

(апарэль — пакатая пляцоўка або платформа для пад'ёму і спуску інвалідных калясак. — **Аўт.**).

Самым прасунутым з'яўляецца сталічны метрапалітэн. На ўсіх станцыях нанесеныя лініі бяспекі для слабавідушчых, або так званыя шуц-лініі, маюцца перагаворныя прылады сувязі, выкананы работы па падаўжэнні поручняў (да нарматыўнай даўжыні) на лесвічных сходах дзевяці станцый. Ліфтамі і пад'ёмнымі платформамі абсталяваны 14 станцый метрапалітэна з 29. Эксплуатуецца 24 ліфты і столькі ж пад'ёмных платформ. Акрамя таго, пасажыры з абмежаванымі магчымасцямі могуць скарыстацца 15 гусенічнымі лесвічнымі пад'ёмнікамі.

Работа па адаптацыі гарадскога транспарту для фізічна аслабленых людзей працягваецца. У 2019 годзе плануецца набыць яшчэ 158 нізкападлогавых аўтобусаў і 43 электробусы.

Як прыстасаваныя для людзей з інваліднасцю шматкватэрныя дамы?

З 2011 года са сродкаў мясцовага бюджэту выдзяляецца мэтавае фінансаванне на стварэнне безбар'ернага асяроддзя па месцы жыхарства інвалідаў. За гэты час установлены 453 пандусы і 289 пад'ёмных прылад па месцы жыхарства інвалідаў-калясачнікаў. Перш за ўсё там, дзе жывуць актыўныя і працаздольныя людзі з інваліднасцю, і тыя, хто выхоўвае дзяцей-інвалідаў.

У жылых дамах, дзе ў вестыбюльна-ўваходнай групе ёсць перапад вышынь і маецца тэхнічная магчымасць, устанаўліваюцца стацыянарныя пад'ёмныя платформы. У пад'ездах, дзе няма тэхнічных умоў для ўстаноўкі пандуса ці пад'ёмніка, ёсць іншыя варыянты: пакупка тэлескапічнага пандуса (які разгортваецца па лесвіцы) з прыцягненнем матэрыяльнай дапамогі са сродкаў ФСАН, паслугі мабільнага травалатара (транспартна-пад'ёмнага сродку, што працуе па прынцыпе эскалатара) з выездам на адрас пражывання (маецца пакуль толькі ў Маскоўскім раёне Мінска).

І самы крайні і няпросты варыянт — гэта абмен жылля. У спісе тых, хто мае патрэбу ў такім абмене па Мінску, цяпер 13 чалавек. Інвалідам I або II групы, якія маюць патрэбу ў сацыяльным жыллі, горад можа прапанаваць кватэру ў спецыяльным доме для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў па праспекце Ракасоўскага, 50. У гэтым жылым комплексе абсталявана цалкам даступнае асяроддзе для інвалідаў-калясачнікаў.

Мінск мае патрэбу ў сурдаперакладчыках

Сёння ў горадзе працуюць 10 сурдаперакладчыкаў — па аднаму ў раённых ТЦСАН і адзін спецыяліст — у цэнтры прыёму-перадачы паведамленняў у экстранныя службы ад людзей з парушэннямі слыху. Дарэчы, паслугі дадзенага цэнтра аказаліся вельмі запатрабаваныя. У мінулым годзе ён аказаў дапамогу 1327 мінчанам. І каля 250 чалавек скарысталіся суправаджэннем сурдаперакладчыка ў рамках паслуг, якую аказваюць у ТЦСАН.

А вось ва ўстановах аховы здароўя і адукацыі сурдаперакладчыкаў не хапае. Больш за тое, у сталіцы ёсць шэраг прадпрыемстваў, дзе працуюць людзі з парушэннямі слыху. Там задзейнічаны спецыялісты сурдаперакладу. Але шмат хто з іх хутка выйдзе на пенсію, і грамадскія аб'яднанні людзей са слабым слыхам турбуюцца з гэтай прычыны. Таму ў сталіцы плануюць пачаць навучанне спецыялістаў сурдаперакладу на базе вышэйшай адукацыі, па паскоранай праграме. Групы ў 20—30 чалавек, на думку спецыялістаў, для Мінска будзе дастаткова.

Святлана БУСЬКО.

ДАРЭЧЫ

МІНБУДАРХІТЭКТУРЫ — АБ ПАТРАБАВАННЯХ ДА АРГАНІЗАЦЫІ БЕЗБАР'ЕРНАГА АСЯРОДДЗЯ

У Беларусі зацверджана Канцэпцыя ўніверсальнага дызайну ў галіне стварэння безбар'ернага асяроддзя і ўдасканалены нормы тэхнічных нарматыўна-прававых актаў. У 2018 годзе ўведзены ў дзеянне тэхнічны кодэкс існуючай практыкі «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб. Будаўнічыя нормы праектавання».

Гэты дакумент устанаўлівае абавязковыя патрабаванні пры праектаванні новых будынкаў, а таксама пры рамонце і рэканструкцыі жылых і грамадскіх будынкаў і будынкаў вытворчых прадпрыемстваў, каб фізічна аслабленыя асобы (у тым ліку з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, сляпыя і тыя, хто слаба бачаць, глухія і людзі са слабым слыхам) мелі магчымасць самастойнага перамяшчэння.

Таксама ў мінулым годзе былі ўведзены кодэксы, якія прадугледжваюць стварэнне элементаў безбар'ернага асяроддзя. Так, пры праектаванні павінна забяспечвацца такая шырыня ўваходнага праёму, каб людзі на крэслах-калясках маглі яго пераадолець. Абавязкова павінны быць пандусы, пад'ёмныя платформы: і на ўваходзе, і далей, каб трапіць на першы паверх. На ўваходзе ў будынак не павінна быць турнікетаў, брамак, дзвярных палотнаў з двухбаковымі завесамі і іншых механічных прылад. Дзверы павінны адчыняцца лёгка, па магчымасці, у грамадскіх будынках лепш устанаўліваць дзверы з аўтаматычным адчыненнем. Уваход павінен быць прыкметны. Для гэтага павінна быць забяспечана сігнальная інфармацыя: кантрасная афарбоўка, візуальныя і тактыльныя паказальнікі, паказальнікі з выкарыстаннем шрыфта Брайля ды інш.

У абсталяваных ліфтамі жылых дамах пры неабходнасці лесвіцы, якая вядзе на ганак, павінна быць прадугледжана пад'ёмная платформа з вертыкальным перамяшчэннем.

Пры перападзе вышынь не больш за 0,6 м замест пад'ёмнай платформы дапускаецца прылада пандуса.

Разам з тым, па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Вольгі ВЕРАМ,** Мінбудархітэктуры цяпер разглядае пытанне ўнясення змяненняў у нарматыўныя патрабаванні для прылады пандуса без прылады лесвіцы, каб забяспечваць доступ у будынкі ўсіх катэгорый грамадзян.

БАНК ДАБРАБЫТ

Открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт»
220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1, УНН 807000002

Отчет о финансовом положении на 31 декабря 2018 г.

в тысячах белорусских рублей

	Прим.	31 декабря 2018 г.	31 декабря 2017 г.*
Активы			
Денежные средства и их эквиваленты	6,7	187 589	156 190
Средства в кредитных организациях	6,8	14 281	30 273
Производные финансовые активы	9	289	116
Кредиты клиентам	6,10	574 693	522 550
Ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	6,11	70 624	104 282
Ценные бумаги, оцениваемые по амортизированной стоимости	6,12	228 545	35 326
Текущие требования по налогу на прибыль		-	-
Актив по отложенному налогу на прибыль	17	2 883	35
Основные средства	13	40 384	37 301
Нематериальные активы	14	4 443	3 995
Инвестиционная собственность	15	294	-
Активы, предназначенные для продажи	16	226	101
Прочие активы	18	9 765	5 707
Итого активы		**1 134 016**	**895 876**
Обязательства			
Средства кредитных организаций	19	85 684	30 108
Производные финансовые обязательства	9	23	-
Средства клиентов	20	885 029	751 289
Выпущенные долговые ценные бумаги	21	37 549	3 097
Текущие обязательства по налогу на прибыль		523	656
Отложенные обязательства по налогу на прибыль		-	-
Резервы	6	1 607	773
Прочие обязательства	18	6 042	3 556
Итого обязательства		**1 016 457**	**789 479**
Капитал			
Уставный капитал	22	54 069	34 255
Фонд переоценки ценных бумаг		(166)	672
Фонд переоценки основных средств		11 933	8 372
Прочие фонды переоценки		640	-
Нераспределенная прибыль		51 083	63 098
Итого капитал		**117 559**	**106 397**
Итого капитал и обязательства		**1 134 016**	**895 876**

Отчет о прибылях и убытках за год, закончившийся 31 декабря 2018 г.

в тысячах белорусских рублей

	Прим.	2018 г.	2017 г.*
Процентные доходы		85 594	75 866
Процентные расходы		(46 781)	(40 138)
Чистый процентный доход	**24**	**38 813**	**35 728**
Восстановление / (создание) резерва от обесценения финансовых инструментов	6	100	(7 402)
Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов		**38 913**	**28 326**
Комиссионные доходы		19 522	15 775
Комиссионные расходы		(9 681)	(5 366)
Чистые комиссионные доходы	**25**	**9 841**	**10 409**
Реализованные доходы/(расходы) по операциям с ценными бумагами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(92)	(99)
Чистые доходы по операциям в иностранной валюте			
- торговые операции		14 998	17 045
- переоценка валютных статей		6 347	4 083
Прочие доходы	26	5 348	2 804
Непроцентные доходы		**36 442**	**34 242**
Общие административные расходы	27	(49 498)	(42 636)
Создание резервов по прочим активам и обязательствам	6	142	1 650
Непроцентные расходы		**(49 356)**	**(40 986)**
Прибыль до расходов по налогу на прибыль		**25 999**	**21 582**
Экономия/(расход) по налогу на прибыль	17	(5 260)	(2 921)
Прибыль за отчетный год		**20 739**	**18 661**

Отчет о совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2018 г.

в тысячах белорусских рублей

	Прим.	2018 г.	2017 г.*
Прибыль за год		**20 739**	**18 661**
Прочий совокупный доход, подлежащий впоследствии реклассификации в состав прибыли или убытка при выполнении определенных условий			
Реализованные доходы/(расходы) по операциям с ценными бумагами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход, реклассифицированные в отчет о прибылях и убытках		92	99
Нереализованные расходы по операциям с ценными бумагами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(930)	(142)
Восстановление/(создание) резерва по ожидаемым кредитным убыткам		(266)	-
Чистый прочий совокупный доход (расход), подлежащий впоследствии реклассификации в состав прибыли или убытка при выполнении определенных условий		**(1 104)**	**(43)**
Прочий совокупный доход, не подлежащий впоследствии реклассификации в состав прибыли или убытка			
Переоценка зданий	13	4 968	-
Влияние налога на прибыль	17	(1 231)	-
Чистый прочий совокупный расход, не подлежащий впоследствии реклассификации в состав прибыли или убытка		**3 737**	**-**
Прочий совокупный доход/(расход) за год, за вычетом налогов		**2 633**	**(43)**
Итого совокупный доход за год		**23 372**	**18 618**

Отчет об изменениях в капитале за год, закончившийся 31 декабря 2018 г.

в тысячах белорусских рублей

	Прим.	Уставный капитал	Фонд переоценки ценных бумаг	Фонд переоценки основных средств	Прочие фонды переоценки	Нераспределенная прибыль	Итого капитал
На 31 декабря 2016 г.		**34 255**	**715**	**8 372**	**-**	**46 707**	**90 049**
Прибыль за год		-	-	-	-	18 661	**18 661**
Прочий совокупный доход за год		-	(43)	-	-	-	**(43)**
Итого совокупный доход за год		**-**	**(43)**	**-**	**-**	**18 661**	**18 618**
Дивиденды акционерам Банка	22	-	-	-	-	(876)	(876)
Оказание безвозмездной (спонсорской) помощи		-	-	-	-	(1 394)	(1 394)
На 31 декабря 2017 г.		**34 255**	**672**	**8 372**	**-**	**63 098**	**106 397**
Эффект применения МСФО (IFRS) 9	5	-	-	-	**906**	**(10 001)**	**(9 095)**
Скорректированный остаток на 1 января 2018 г.		**34 255**	**672**	**8 372**	**906**	**53 097**	**97 302**
Прибыль за год		-	-	-	-	20 739	**20 739**
Увеличение уставного фонда		19 814	-	-	-	(19 814)	-
Прочий совокупный доход за год		-	(838)	3 561	(266)	176	**2 633**
Итого совокупный доход за год		**19 814**	**(838)**	**3 561**	**(266)**	**1 101**	**23 372**
Дивиденды акционерам Банка		-	-	-	-	(3 115)	(3 115)
На 31 декабря 2018 г.		**54 069**	**(166)**	**11 933**	**640**	**51 083**	**117 559**

Отчет о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2018 г.

в тысячах белорусских рублей

	Прим.	2018 г.	2017 г.*
Денежные потоки от операционной деятельности			
Проценты полученные		94 642	77 125
Проценты выплаченные		(46 616)	(41 093)
Комиссии полученные		20 116	15 054
Комиссии выплаченные		(9 494)	(5 072)
Реализованные доходы за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой		14 848	16 901
Реализованные доходы / (расходы) по операциям с ценными бумагами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(92)	99
Прочие доходы полученные		5 371	2 812
Общие административные расходы		(46 103)	(39 203)
Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах		**32 672**	**26 623**
Чистое (увеличение) / уменьшение операционных активов			
Средства в кредитных организациях		15 238	(24 273)
Кредиты клиентам		(51 286)	(2 664)
Прочие активы		(5 444)	28
Чистое увеличение / (уменьшение) операционных обязательств			
Средства кредитных организаций		54 960	(152 222)
Средства клиентов		107 055	156 239
Прочие обязательства		6 201	(1 651)
Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль		**159 396**	**2 080**
Уплаченный налог на прибыль		(9 528)	(739)
Чистое поступление / денежных средств от операционной деятельности		**149 868**	**1 341**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности			
Поступления от реализации / погашения ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		171 493	138 273
Приобретение ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(206 888)	(117 532)
Поступления от реализации / погашения ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости		1 474 404	538 706
Приобретение ценных бумаг, оцениваемых по амортизированной стоимости		(1 592 918)	(565 840)
Приобретение основных средств и нематериальных активов		(3 913)	(5 297)
Поступления от реализации основных средств, внеоборотных активов, предназначенных для продажи		1 774	32
Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности		**(156 048)**	**(11 658)**
Денежные потоки от финансовой деятельности			
Поступления от выпуска долговых ценных бумаг		168 276	34 590
Погашение долговых ценных бумаг		(133 883)	(33 169)
Дивиденды, выплаченные акционерам Банка		(3 115)	(876)
Чистое поступление / (расходование) денежных средств в финансовой деятельности		**31 278**	**545**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты		6 807	9 103
Чистое увеличение / (уменьшение) денежных средств и их эквивалентов		**31 905**	**(669)**
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года	**7**	**156 190**	**156 859**
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года	**7**	**188 095**	**156 190**

**** Банк начал применение МСФО (IFRS) 9 с 1 января 2018 года. В соответствии с выбранными методами перехода сравнительная информация не пересчитывается. В результате применения МСФО (IFRS) 9 Банк изменил порядок представления определенных статей, представление сравнительных данных также изменено соответствующим образом.***

Подписано и утверждено к выпуску от имени руководства ОАО «Банк Дабрабыт»

Лихогруд И.В. — Председатель Правления

Дорожкин А.В. — Главный бухгалтер

5 марта 2019 г.

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам, Наблюдательному совету, Аудиторскому комитету, Правлению Открытого акционерного общества «Банк Дабрабыт»

Аудиторское мнение

Реквизиты аудируемого лица:

Наименование: открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт» (сокращенное наименование банка – ОАО «Банк Дабрабыт»)

Место нахождения: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1;

Сведения о государственной регистрации: открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 24 октября 2007 года, регистрационный номер 807000002.

УНП: 807000002.

Мы провели аудит финансовой отчетности ОАО «Банк Дабрабыт» (далее – «Банк»), состоящей из:
отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2018 года;
отчета о совокупном доходе, отчетов об изменении собственного капитала и движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату; а также
Примечаний к финансовой отчетности, включающих краткое изложение основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение ОАО «Банк Дабрабыт» по состоянию на 31 декабря 2018 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (далее – «МСФО»).

Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита (далее – «МСА»). Наши обязанности, предусмотренные указанными стандартами, более подробно рассматриваются в разделе «Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности» настоящего заключения. Мы являемся независимыми по отношению к ОАО «Банк Дабрабыт» в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров, опубликованным Комитетом по международным этическим стандартам для бухгалтеров, и выполнили наши иные этические обязанности в соответствии с требованиями данного Кодекса.

Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам. В отношении каждого из указанных ниже вопросов наше описание того, как соответствующий вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе Ответственность аудитора за аудит финансовой отчетности нашего заключения, в том числе по отношению к этим вопросам. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанных ниже вопросов, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой финансовой отчетности.

Резерв под обесценение кредитов и авансов клиентам, а также резерв по обязательствам кредитного характера

В связи с существенностью резерва под обесценение кредитов и авансов клиентам и обязательств кредитного характера для финансового положения Банка, а также в связи со сложностью и необходимостью применения суждений в отношении оценки ожидаемых кредитных убытков в соответствии с новым стандартом МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты»(«МСФО 9»), данный вопрос является одним из ключевых вопросов аудита.

Для определения значительного увеличения кредитного риска с даты первоначального признания, как на индивидуальной, так и на портфельной основе, а также для расчета ожидаемых кредитных убытков («ОКУ»), необходимо применять суждение. Оценка увеличения кредитного риска основана на относительном изменении в кредитных рейтингах, длительности просроченной задолженности и прочих объективных и субъективных факторах. Выбор пороговых значений, при которых увеличение кредитного риска признается значительным, таких как величина ухудшения кредитного рейтинга, также носит субъективный характер.

В ходе нашего аудита мы обратили особое внимание на следующее:

- оценка моделей кредитного риска и допущений, используемых для определения ключевых параметров резервирования и ожидаемых кредитных убытков по портфелю;
- оценка суждений руководства в отношении выявления значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе, с использованием количественных и качественных критериев;
- тестирование ожидаемых будущих денежных потоков, в том числе денежных потоков, источником которых является обеспечение, в отношении существенных кредитно- обесцененных кредитов и авансов клиентам и обязательств кредитного характера.

Наши аудиторские процедуры включали оценку методологии расчета ожидаемых кредитных убытков, разработанной Банком в соответствии с МСФО (IFRS) 9 для оценки резервов под обесценение кредитов и авансов клиентам, а также обязательств кредитного характера.

Расчет ОКУ включает методики оценки, в которых используются существенные ненаблюдаемые исходные данные и факторы, такие как внутренние кредитные рейтинги, а также комплексное статистическое моделирование и экспертное суждение. Данные методики используются с целью определения вероятности дефолта, величины кредитного требования, подверженной риску дефолта и уровня потерь при дефолте на основании имеющихся исторических данных и внешней информации, скорректированных с учетом прогнозов, включая прогнозные макроэкономические переменные.

Для расчета ожидаемых кредитных убытков в отношении существенных финансовых активов, подвергнувшихся кредитному обесценению на индивидуальной основе, требуется анализ финансовой и нефинансовой информации и широкое использование допущений. Оценка будущих денежных потоков основывается на таких существенных ненаблюдаемых исходных данных, как текущие и прогнозные финансовые показатели заемщика, стоимость обеспечения и оценка вероятности возможных сценариев. Использование иных методик моделирования, допущений и прогнозов может привести к существенно иным оценкам резерва под ожидаемые кредитные убытки.

Информация о резерве под ожидаемые кредитные убытки в отношении кредитов и авансов клиентам, а также обязательств кредитного характера представлена в Примечании 6 «Резервы под обесценение», Примечании 10 «Кредиты клиентам» и Примечании 23 «Договорные и условные обязательства, условные активы», Примечание 29 «Управление рисками» к финансовой отчетности.

Мы оценили разумность факторов кредитного риска и пороговых значений, выбранных руководством для определения значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе. Мы оценили последовательность применения критериев, выбранных руководством, на отчетную дату.

При тестировании обесценения, рассчитанного на портфельной основе, мы проанализировали лежащие в основе статистические модели, ключевые исходные данные и допущения, а также прогнозную информацию, используемую при расчете ожидаемых кредитных убытков. Для выбранных существенных кредитов, мы провели проверку внутренних кредитных рейтингов, факторов кредитного риска и классификацию по стадиям. В отношении выбранных нами существенных обесцененных корпоративных кредитов, мы, совместно со специалистами в области оценки, проанализировали допущения в отношении будущих денежных потоков, включая стоимость обеспечения и вероятность возможных сценариев. Мы рассмотрели результаты проведенного Банком последующего тестирования моделей, применяемых для целей МСФО (IFRS) 9.

Мы также изучили раскрытие в финансовой отчетности Банка касательно резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам и авансам клиентам, а также под обязательства кредитного характера.

Оценка зданий

Методы оценки справедливой стоимости зданий могут носить субъективный характер и основываться на различных допущениях о ценообразующих факторах. Различные методы оценки и использование допущений могут оказывать существенное влияние на результат оценки справедливой стоимости. В силу существенности стоимости недвижимости, которая по состоянию на 31 декабря 2018 года составляет 31 820 тыс. рублей, а также высокой степени субъективного суждения и потенциального влияния на финансовую отчетность Банка, оценка справедливой стоимости зданий рассматривается нами как один из ключевых вопросов аудита.

Мы выполнили процедуры в отношении информации, раскрытой в Примечании 13 «Основные средства» к финансовой отчетности, на предмет полноты и соответствия требованиям законодательства Республики Беларусь.

Для определения рыночной стоимости зданий на отчетную дату руководство Банка привлекало независимого оценщика. Наши аудиторские процедуры в отношении оценки недвижимости включали анализ компетентности и объективности независимого оценщика, привлеченного руководством Банка, изучение принятых существенных допущений, а также сопоставление исходных данных, использованных при оценке, с доступной рыночной информацией о стоимости объектов и иными данными, наблюдаемыми на рынке.

Обязанности аудируемого лица по подготовке финансовой отчетности

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление финансовой отчетности в соответствии с МСФО и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки финансовой отчетности аудируемого лица.

Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с МСА, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с МСА, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками, направленные на снижение этих рисков; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие, таких как сговор, подлог или подделку документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей отношение к аудиту финансовой отчетности, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Директор / Управляющий партнер BDO в Беларуси — А. Н. Шкодин

Аудитор, возглавлявший аудит — С. В. Маханькова

Дата аудиторского заключения: 5 марта 2019 года

СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРЕ:

Наименование:	Общество с ограниченной ответственностью «БДО»
Место нахождения:	Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7
Сведения о государственной регистрации:	Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года
УНП:	190241132

Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка:
https://bankdabrabyt.by/about/finance/

К@нтыненты

АД САМАВАРА ДА ГАЙВАНІ

Як развіваецца чайная індустрыя?

Сёлетні май насамрэч «чайны» месяц. Галоўныя тэматычныя інфармацыйныя нагоды, вядома ж, мелі кітайскую «прапіску». Днямі ў Ханьчжоу прайшла III Міжнародная выстаўка чайнай індустрыі. Удзел у маштабнай імпрэзе ўзялі больш чым 1,5 тысячы кітайскіх вытворцаў і 176 буйных замежных заказчыкаў з амаль трох дзясяткаў краін і рэгіёнаў свету, уключаючы Брытанію, Новую Зеландыю, Шры-Ланку, Малайзію, Індыю, Японію і Паўднёвую Карэю. Пра гэта інфармагенцтву «Сіньхуа» паведаміў кіраўнік дэпартамента рынку і інфарматызацыі пры Міністэрстве сельскай гаспадаркі і сельскіх спраў КНР Тан Кэ. Сярод усяго іншага ў межах выстаўкі адбыўся міжнародны саміт кітайскай чайнай індустрыі. А на наступным тыдні ў правінцыі Цзянсу, што на ўсходзе Паднябеснай, пройдзе выстаўка на тэму чаю і крыніц, паведаміла газета China Daily. Як бачым, развіццю стратэгічнай, іміджавай галіны ўдзяляецца вялікая ўвага. Чым абумоўлены «чайны эфект» у сусветным маштабе?

Узрост — 5000 гадоў

Па папулярнасці сярод напояў чай саступае першае месца толькі вадзе. Яго ўжывае 2/3 насельніцтва свету — значна часцей, чым каву. У розных кутках планеты чай заварваюць па-свойму: ад расійскага самавара — да кітайскай гайвані. Радзімай легендарнага прадукту лічаць Паднябесную, дзе пра яго даведаліся амаль 5 тысячагоддзяў назад. Менавіта з кітайскай пайшлі назвы чаю ў розных мовах свету. Першапачаткова ён ужываўся ў якасці гаючага лячэбнага адвара. Паводле легенды, кітайскі імператар Шэн Нун (2737 гадоў да н. э.) выпадкова адкрыў напой, калі лісток чайнага дрэва ўпаў у яго міску з гарачай вадой, пакуль манарх быў у садзе. Адвар яму вельмі спадабаўся. У 200 годзе да н.э. імператарам дынастыі Хань быў выдадзены ўказ, што для вызначэння чаю павінен выкарыстоўвацца спецыяльны пісьмовы знак, які адлюстроўвае драўляныя галінкі, траву і чалавека паміж імі. Гэты іерогліф стаў сімвалам раўнавагі паміж чалавекам і прыродай. Імператар дынастыі Тан (618—907 гг.) Лу Юй напісаў трактат пра чай, дзе падрабязна выклаў інфармацыю аб паходжанні, спосабах заварвання і гаючых уласцівасцях напою.

Сыравіна для вырабу — лісце чайнага куста, які вырошчваюць у масавай колькасці на спецыяльных плантацыях. Для росту гэтай расліны неабходны цёплы клімат з дастатковай колькасцю вільгаці, якая не застойваецца ў каранях. Большасць плантацый размяшчаецца на горных схілах у раёнах з трапічным або субтрапічным кліматам. У Кітаі, Індыі і Афрыцы, дзе вырабляецца найбольшая доля чаю, збор праводзіцца да чатырох раз у год. Найбольш цэняцца чаі першых двух ураджаяў. Паўночная мяжа тэрыторыі, дзе вырошчванне культуры эканамічна мэтазгодна, праходзіць прыблізна на шыраце былых паўднёвых савецкіх рэспублік (Азербайджан, Грузія, Краснадарскі край Расіі). У больш высокіх шыротах чайны куст яшчэ можа расці, але культываваць яго ў мэтах атрымання сыравіны стратна.

Падрыхтоўка чайнага ліста ўключае папярэднюю сушку (вяленне), скручванне, больш ці менш працяглае ферментатыўнае акісленне, канчатковую сушку. Іншыя аперацыі ўводзяцца ў працэс толькі для вытворчасці асобных відаў і гатункаў чаю. Сыравіну збіраюць і сартуюць уручную, для прадукцыі найбольш высокай гатункавай катэгорыі выкарыстоўваюцца пупышкі і самае маладое лісце.

Ад Бутана да Канады

Чай — тавар, які мае неверагодна высокі попыт. Па гэтай прычыне яго вытворчасць — вельмі выгаднае ўкладанне капіталу. Агульная вытворчасць і продаж чаю ацэньваюць у дзясяткі мільярдаў долараў. Кошт некаторых элітных гатункаў перавышае $1000 за 100 грамаў. 10 краін забяспечваюць больш чым 90 працэнтаў сусветнай вытворчасці чаю. Гэта Кітай, Індыя, Кенія, Шры-Ланка, Турцыя, В'етнам, Інданезія, М'янма, Аргенціна і Японія.

Сённяшняе першынства Кітая стала вынікам уражлівага сярэднегадавога росту ў 6,5 працэнта ў параўнанні з вытворчасцю 79 тысяч тон у 1961-м. Паднябесная вырабляе, п'е, экспартуе. У аглядной будучыні лідарства наўрад ці падвергнецца сумневу. Вытворчасць чаю ў параўнанні з 2007 годам выраслa больш чым удвая і дасягнула астранамічных 2,6 мільёна тон — каля

45 працэнтаў ад сусветнага паказчыка. З не меншай інтэнсіўнасцю павялічваліся плошчы чайных плантацый. Сёння гэта больш чым тры мільёны гектараў — 60 працэнтаў сусветнага паказчыка.

Індыя цяпер з'яўляецца другім па велічыні вытворцам чаю ў свеце. Гадавы аб'ём вырабу перавышае 1,3 мільёна тон. На чале вытворчасці чаю — штаты Асам, Заходняя Бенгалія, Тамілнад і Керала. Чайная прамысловасць — другі па велічыні працадаўца ў Індыі: 3,5 млн работнікаў, у асноўным жанчыны.

Кенія — з нядаўняга часу трэці па велічыні вытворца чаю ў свеце, кантынентальны лідар і адзіная афрыканская краіна ў топ-10 вядучых сусветных гульцоў. У адрозненне ад Індыі і Шры-Ланкі, дзе вялікая частка прадукцыі вырошчваецца на вялікіх плантацыях, 90 працэнтаў чаю ў Кеніі вырабляецца на плантацыях плошчай каля аднаго гектара, што стварае пэўную напружанасць у гэтай галіне. Чай займае цэнтральнае месца ў эканоміцы Кеніі, яго экспарт складае 26 працэнтаў ад агульнай экспартнай выручкі і каля чатырох працэнтаў ВУП. Замест узбуйнення вытворчасці ў Кеніі вырашылі інвеставаць грошы ў даследаванні і распрацоўку новых гатункаў чаю, якія могуць мець больш высокі ўраджай і вялікую ўстойлівасць да зменлівых кліматычных умоў. Раёны вырошчвання чаю знаходзяцца ў высакагорнай мясцовасці на захадзе краіны, дзе кліматычныя ўмовы спрыяльныя для вытворчасці. Большая частка прадукцыі — чорны чай, які выкарыстоўваецца ў купажах. Гэтая афрыканская краіна — найбуйнейшы пастаўшчык гэтай прадукцыі на сусветны рынак. Тым не менш у апошнія гады ў Кеніі назіраецца асаблівая цікавасць да вытворчасці новых відаў — зялёных і белых. Гэтая краіна таксама з'яўляецца месцам распрацоўкі новых гатункаў чайнай расліны, у тым ліку пурпурнага чаю.

Чацвёрты лідар — Шры-Ланка, якая летась адзначыла 150-годдзе сваёй чайнай індустрыі. Цэйлонскі чай — сусветны брэнд, але адзначалі юбілей не сказаць каб з вялікім аптымізмам. Зараз пастаўкі чаю Шры-Ланкай на сусветны рынак не паспяваюць за ростам попыту, сваё звыклае 3-е месца яна саступіла Кеніі. Апошнія 50 гадоў аб'ёмы вытворчасці тут павялічваліся, але нізкімі тэмпамі, а доля ў сусветным экспарце скарацілася з 21 да 6 працэнтаў. У параўнанні з іншымі лідарамі краіна абмежаваная ў людскіх і зямельных рэсурсах.

Чай насамрэч «крочыць па планеце». Ёсць звесткі аб вытворчасці на востраве Сан-Мігель (Партугалія) і на Сейшэльскіх астравах. У Новай Зеландыі займаюцца вырошчваннем арганічнага чаю. У Бутане вядомы вытворца Samcholing Tea Estate. У Канадзе чай вырошчваюць на ціхаакіянскім узбярэжжы. У Чылі плантацыі Salus вырабляюць у невялікіх колькасцях да 200 гатункаў. У Германіі ёсць некалькі эксперыментальных праектаў па вырошчванні чаю. Вядомым вытворцам з'яўляецца Tschanara, якая размешчана за 30 кіламетраў ад Кёльна. У Нігерыі ёсць некалькі спецыялізаваных фірмаў, у тым ліку плантацыя, якая належыць Lipton. У ЗША шмат невялікіх чайных фермаў, з найбольшай канцэнтрацыяй на Гаваях. У Вялікабрытаніі адпаведную прадукцыю вырошчвае батанічны сад Tregothnan Tea Estate. Невялікія фермы пачалі з'яўляцца па ўсёй Шатландыі. Першай была Wee Tea Plantation.

У 2016 годзе створана «Асацыяцыя шатландскіх вытворцаў чаю».

Фактары росту

Паводле апошніх прагнозаў, сусветнае спажыванне і вытворчасць чаю будуць расці на працягу наступнага дзесяцігоддзя, што абумоўлена ўстойлівым попытам у краінах, якія развіваюцца, і краінах з пераходнай эканомікай. Гэта створыць новыя магчымасці для атрымання даходаў у сельскіх раёнах і палепшыць харчовую бяспеку ў краінах — вытворцах чаю, перакананы эксперты міжурадавай групы Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (Food and Agriculture Organization, FAO). Грунтоўны даклад міжурадавай групы быў складзены паводле звестак, атрыманых ад краін — членаў FAO, і дапоўнены інфармацыяй FAOSTAT, Міжнароднага камітэта па чаю і іншых крыніц.

Спажыванне асабліва імкліва расце ў Кітаі, Індыі і іншых краінах з пераходнай эканомікай, што тлумачыцца як ростам даходаў насельніцтва, так і дыверсіфікацыяй прадукцыі, уключаючы выхад на такія спецыялізаваныя сегменты, як травяныя і фруктовыя чаі або араматызаваныя гатункі для гурманаў. Паводле прагнозаў экспертаў FAO, сусветная вытворчасць чорнага чаю будзе расці ў сярэднім на 2,2 працэнта ў год і дасягне 4,4 мільёна тон у 2027-м, што галоўным чынам адлюстроўвае павелічэнне вытворчасці ў Кітаі, Кеніі і Шры-Ланцы. Пры гэтым Паднябесная дасягне ўзроўню вытворчасці Кеніі — найбуйнейшага экспарцёра чорнага чаю ў свеце. Чакаецца, што глабальная вытворчасць зялёнага чаю будзе расці яшчэ больш хуткімі тэмпамі: яе гадавы рост складзе 7,5 працэнта і аб'ём вытворчасці дасягне 3,6 мільёна тон да 2027-га, галоўным чынам за кошт Кітая, дзе адпаведны сегмент вытворчасці па прагнозах падвоіцца — з 1,5 мільёна тон у 2015—2017 гадах да 3,3 мільёна тон у 2027-м.

Даклад міжурадавай групы FAO таксама папярэджвае аб тым, што вытворчасць чаю вельмі адчувальная да кліматычных зменаў. Гэтую культуру можна вырошчваць толькі ў пэўных аграэкалагічных умовах і, такім чынам, у вельмі абмежаванай колькасці краін, многія з якіх у значнай ступені схільныя да капрызаў надвор'я. Змяненне тэмпературы і колькасці ападкаў, якое прыводзіць да вялікай колькасці паводак і засух, ужо аказвае ўплыў на ўраджайнасць, якасць і кошт чайнай прадукцыі, прыводзіць да зніжэння даходаў. Чакаецца, што гэтыя кліматычныя змены будуць толькі пагаршацца ў далейшым, патрабуючы неадкладных мер па адаптацыі да гэтага.

Модны прадукт

Глабальны попыт на чай таксама выйграе ад прыцягнення новай кліентуры. Маладыя гарадскія жыхары ў буйных краінах-вытворцах, такіх як Кітай і Індыя, сталі самым хуткарослым сегментам. Яны гатовыя не толькі выкладваць немалыя грошы за спецыялізаваныя гатункі чаю, але і імкнуцца даведацца больш аб напоі, яго якасці, паходжанні. Маладыя людзі з вышэйшага і сярэдняга класа пастаянна знаходзяцца ў пошуку «модных» прадуктаў, якія будуць упісаны ў іх стыль жыцця, які цяпер уключае спажыванне найвышэйшых гатункаў чаю ў вытанчанай атмасферы эксклюзіўных рэстаранаў, гатэляў і кафэ.

У той час як сусветнае спажыванне чаю павялічвалася на працягу апошняга дзесяцігоддзя, краіны Старога Свету, якія традыцыйна імпартуюць гэтую прадукцыю, назіралі зніжэнне ўзроўню спажывання. Эксперты ўпэўнены, што еўрапейскі чайны рынак у значнай ступені насычаны. Спажыванне на душу насельніцтва планамерна зніжалася на працягу больш чым дзесяці гадоў, сутыкаючыся з канкурэнцыяй з боку іншых відаў напояў, у прыватнасці бутыляванай вады. На працягу наступнага дзесяцігоддзя чакаецца, што ў заходніх краінах будзе назірацца тэндэнцыя да яшчэ большага зніжэння тэмпаў росту спажывання. У Вялікабрытаніі, напрыклад, спажыванне, паводле прагнозаў, скароціцца, паколькі чорны чай змагаецца за цікавасць спажыўца ва ўмовах узмацнення канкурэнцыі з боку іншых відаў напояў, у прыватнасці кавы.

У дакладзе сцвярджаецца, што гэтую тэндэнцыю на традыцыйных еўрапейскіх рынках можна спыніць праз дыверсіфікацыю прадукцыі і яе выхад на іншыя сегменты, такія як арганічны чай, а таксама шляхам павышэння дасведчанасці аб карысці для здароўя і самаадчування чалавека, у прыватнасці аб супрацьзапаленчых і антыаксідантных якасцях напою, а таксама аб яго ўласцівасцях, якія стымулююць пахудзенне. Карысць для здароўя разглядаецца ў якасці ключавога фактару росту попыту на напой у будучыні. Тут ёсць свае прыклады: цяпер экалагічна чысты чай набывае ўсё большую папулярнасць у Злучаных Штатах, не ў апошнюю чаргу за кошт імкнення ўсё большай колькасці людзей весці здаровы лад жыцця.

Захар БУРАК.

Чулі?

АРГАНІЗАТАРЫ «ЕЎРАБАЧАННЯ» ПЕРАГЛЕДЗЕЛІ ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Гэта паўплывала не на расклад, але на рэпутацыю прадзюсараў

«Еўрабачанне-2019» у Ізраілі ўжо тыдзень як завяршылася, а скандалы вакол яго не сціхаюць.

Фота БелТА.

То Мадонна замяніла ў відэазапісе свайго выступлення гук на фанаграму, а то днямі Еўрапейскі вяшчальны саюз зрабіў сенсацыйную аб'яву: у фінале з-за чалавечай памылкі былі выкарыстаны няправільныя лічбы ў абвяшчэнні балаў журы. «Каб паважаць як артыстаў, так і членаў ЕВС, якія ўдзельнічалі ў шоу, мы хочам скарэкціраваць канчатковыя вынікі ў адпаведнасці з правіламі», — паведамілі арганізатары. Гэта не змяніла пераможцу шоу і топ-4, а вось Беларусь узнялася ў табліцы на радок вышэй.

Калі перайсці да канкрэтыкі, то гаворка ідзе якраз пра тыя «сукупныя лічбы», якімі замянілі балы дыскваліфікаванага беларускага журы. Пры стандартным маніторынгу галасавання кампанія-партнёр выявіла «недастачу». Цяпер на сайце eurovision.tv змешчаны папраўленыя балы, а Еўрапейскі вяшчальны саюз паабяцаў перагледзець існуючыя працэсы галасавання і схемы кантролю, каб не дапусціць падобнага ў будучыні.

Дункан Лоўрэнс з Нідэрландаў застаўся пераможцам — ужо з 498, а не 492 баламі. Не змянілі сваіх пазіцый Італія і Расія (472 і 370 балаў — +7 і +1 адпаведна). А вось Нарвегія і Швецыя, якія размяшчаліся на 5-м і 6-м радках, памяняліся месцамі. У Беларусі па-ранейшаму 31 бал, але наша краіна на 24-м месцы — вышэй за Германію і Вялікабрытанію.

Перападлік галасоў выклікаў самую розную рэакцыю ўдзельнікаў песеннага конкурсу. Расійскі спявак Сяргей Лазараў, напрыклад, назваў гэта маніпуляцыямі з галасаваннем журы, якія «даволі-такі паднадакучылі». Сапраўды, атрымалася як у тым анекдоце: лыжачкі знайшліся, але асадак застаўся...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Даты | Падзеі | Людзі

25 МАЯ

У краіне

1700 год — пачата будаўніцтва Мінскага касцёла езуітаў — помніка архітэктуры барока (сёння — кафедральны касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі).

1886 год — адкрыта мінскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка. Банк быў створаны для забеспячэння доўгатэрміновым дзяржаўным крэдытам сялян пры куплі імі памешчыцкіх зямель.

1907 год — у Вільні быў створаны Беларускі настаўніцкі саюз, прафесійна-палітычная арганізацыя беларускіх настаўнікаў. Арганізацыя аб'ядноўвала прыхільнікаў беларусізацыі народнай адукацыі. Сваёй мэтай саюз ставіў рэарганізацыю сістэмы адукацыі для ўздыму грамадскай самасвядомасці і культуры народа. Выступаў за свецкі характар адукацыі, адмену саслоўных, нацыянальных і рэлігійных абмежаванняў у сферы адукацыі, перадачу школьнай справы ў распараджэнне настаўніцкіх саветаў, перавод пачатковага навучання на беларускую мову (пры захаванні вывучэння рускай і іншых мясцовых моў), паляпшэнне матэрыяльнага становішча настаўнікаў. Ва ўмовах рэакцыі пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гадоў саюз быў вымушаны спыніць сваю дзейнасць. Аднавіў працу падчас Першай сусветнай вайны, аднак нямецкімі акупацыйнымі ўладамі зноў быў забаронены.

У свеце

1944 год — полк «Нармандыя-Нёман» пад камандаваннем маёра П. Пуяда быў накіраваны на 3-і Беларускі фронт. Полк «Нармандыя-Нёман» — 1-ы асобны французскі знішчальны авіяполк, які ўдзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне ў баях на савецка-германскім фронце супраць фашысцкай Германіі. Па дагаворы паміж урадам СССР і Нацыянальным камітэтам «Свабодная Францыя» ў лістападзе 1942 г. у Савецкі Саюз прыбыў асабовы склад эскадрыллі «Нармандыя» (72 добраахвотнікі), названай у гонар асабліва пацярпелай ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў французскай правінцыі Нармандыя. У сакавіку 1943-га эскадрылля, аснашчаная савецкімі самалётамі-знішчальнікамі Як-1, пачала баявыя дзеянні; у ліпені 1943-га разгорнута ў полк, укамплектаваны французскімі лётчыкамі і савецкім тэхнічным складам. Полк удзельнічаў у Беларускай аперацыі 1944 года, у тым ліку ў разгроме авіяцыі і войск праціўніка на аэрадромах Балбасава (Аршанскі раён), Дакудава (Крупскі раён), пад Талачынам і Барысавам.

1949 год — нарадзіўся (г. Мінск) Леанід Леанідавіч Барткевіч, эстрадны спявак, заслужаны артыст Беларусі. У 1985 годзе скончыў Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва ў Маскве. У 1970—1980 гадах — саліст-вакаліст ансамбля «Песняры», у 1983—1989-м — саліст Беларускага тэлебачання і радыё. З 2003 года — мастацкі кіраўнік зноў створанага ансамбля «Песняры». Запісаў з ансамблем і сола многія беларускія народныя песні.

1889 год — нарадзіўся Ігар Іванавіч Сікорскі (1889—1972), авіяканструктар і прамысловец, адзін з піянераў авіябудавання. Першым у Расіі і свеце распрацаваў канструкцыю і наладзіў серыйны выпуск шматматорных самалётаў: чатырохматорнага самалёта «Рускі віцязь» (1913 год), пасажырскага самалёта і бамбардзіроўшчыка «Ілья Мурамец» (1914 год), трансатлантычнага гідраплана, серыйнага верталёта аднавінтавой схемы (ЗША, 1942 год). З яго імем звязаны розныя і прытым нечаканыя дасягненні канструктарскай думкі, якія кожны раз старанна выводзілі сусветную авіяцыю на новы ўзровень.

1907 год — упершыню ў гісторыі жанчыны прынялі ўдзел у пасяджэннях парламента. Гэта адбылося ў Фінляндыі, якая ўваходзіла тады ў склад Расійскай імперыі. У 1906 г. жанчынам у Фінляндыі было дадзена права выбіраць і быць абранымі. На парламенцкіх выбарах, якія прайшлі ў сакавіку 1907 г., у лік 200 членаў фінскага парламенту ўвайшлі і 19 жанчын.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.53	21.21	16.28
Віцебск	4.35	21.18	16.43
Магілёў	4.43	21.11	16.28
Гомель	4.47	21.00	16.13
Гродна	5.10	21.35	16.25
Брэст	5.18	21.27	16.09

Месяц

Поўня 19 мая.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Германа, Дзяніса, Пятра.*
К. *Віялеты, Магды, Барыса, Лявона, Рыгора, Урбана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Жонкі дзекабрыстаў паехалі за імі ў ссылку, таму што недагаварылі.

— Сфатаграфуй мяне, калі ласка, з кветкамі.
— Добра, давай. Дзе кветкі?
— Вось і я пра гэта хацела спытаць: «Дзе кветкі?»

Аўтамабіль, з вокнаў якога гучала шостая сімфонія Чайкоўскага, дзве гадзіны не даваў кампаніі дырыжораў спакойна нанізаць шашлыкі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1607.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 мая 2019 года.